РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

9 КРАСАВІКА 2025 г. СЕРАДА № 69 (30457)

«НАМ ТРЭБА ЎЗМАЦНЯЦЬ СВАЁ»

Аб чым Прэзідэнт гаварыў у інтэрв'ю МТРК «Мір»

(Працяг на 2-й стар.)

ЗЯЛЁНАЯ ЭКАНОМІКА

СОТНІ ТЫСЯЧ ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ

У Беларусі ствараюцца ўсе ўмовы для ўвасаблення тэхналогій будучыні

Дзякуючы сістэмнай падтрымцы Прэзідэнта і зладжанай рабоце дзяржаўных органаў, электрамабілі перасталі быць тэхналогіяй будучыні — яны сталі рэальнасцю, даступнай кожнаму беларусу. Ствараюцца і рэалізоўваюцца дзяржаўныя праекты і праграмы, накіраваныя на развіццё электрамабільнага транспарту.

СТАР. 5

ЗНАЙСЦІ І АБЯСШКОДЗІЦЬ: ВЫБУХУ НЕ БУДЗЕ

3

ПАРАДАК ЯК НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ТРАДЫЦЫЯ

МС

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

ПЕРСПЕКТЫВА

АЦАНІЦЬ МАГЧЫМАСЦІ І ПРАПАНАВАЦЬ ПЕРАВАГІ

Шэраг мерапрыемстваў пройдзе ў Беларусі ў рамках месяца дзелавога турызму

Красавік аб'яўлены месяцам дзелавога турызму ў нашай краіне. Беларусь апошнім часам з'яўляецца прывабным рынкам у гэтым кірунку для вялікіх кампаній з суседняй краіны. Буйныя банкі і фінансавыя карпарацыі, рытэйл, якія маюць разгалінаваную сетку па ўсёй Расіі, нярэдка выбіраюць Мінск для правядзення дзелавых мерапрыемстваў. Сярод краін постсавецкай прасторы Беларусь знаходзіцца ў выйгрышным становішчы, улічваючы наяўнасць прамых авіярэйсаў з многіх вялікіх гарадоў Расіі і вялікую колькасць сродкаў размяшчэння. А адкрыццё Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра стварыла дадатковую пляцоўку для дзелавых мерапрыемстваў у новым сучасным фармаце.

СТАР. 13

Фота Лізаветы ГОЛАД

«НАМ ТРЭБА ЎЗМАЦНЯЦЬ СВАЁ»

Меркаванне Прэзідэнта аб падзеях на знешнім вектары і падыходы да ўнутраных спраў — фрагменты інтэрв'ю МТРК «Мір»

Фота БелТА.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір». Гутарку з беларускім лідарам правёў старшыня МТРК «Мір» Радзік Батыршын. Журналіста цікавіла меркаванне Аляксандра Лукашэнкі па шырокім спектры пытанняў: ад унутранай палітыкі Беларусі да пазіцыі кіраўніка дзяржавы па пытаннях міжнароднага парадку дня. Пагаварылі пра самыя актуальныя тэмы: бяспеку ў рэгіёне, сакральны сэнс 80-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, інтэграцыйнае ўзаемадзеянне. Аляксандр Лукашэнка шчыра адказаў і на пытанні асабістага характару.

«МЫ НЕ ХОЧАМ БЫЦЬ ЧАРГОВЫ РАЗ ПАДМАНУТЫМІ»

Пачалі з «вострага». «Ці ўлічваеце вы рызыкі ад вайны пошлін, абвешчанай прэзідэнтам Трампам, якая выклікала шок на біржах?» — спытаў Радзік Батыршын. Аляксандр Лукашэнка адказаў як кіраўнік дзяржавы і як эканаміст: «Гэта мяне насцярожыла». Але, расказаў Прэзідэнт, разам з расійскім калегам Уладзімірам Пуціным, абмяркоўваючы гэта пытанне, яны прыйшлі да высновы, што пакуль за гэтым трэба назіраць. «Вы што, упэўненыя, што так і будзе, як Дональд заявіў? Ён ужо ўчора заявіў, што гатовы весці перагаворы то з Кітаем, то яшчэ з кімсьці для таго, каб заключыць здзелку па тарыфах. Гэта значыць, яны гатовыя і адступіць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар звярнуў увагу, што эканоміка ЗША ўваходзіць у лік вядучых у свеце, займае значную долю сусветнага ВУП. «А яны ж аб'явілі 75 працэнтам краін вайну па ВУП: Японіі той жа, Еўрасаюзу і гэтак далей. «Вось мы абыдземся». Можа, і абыдзецеся, вырабіце сваю прадукцыю для таго, каб забяспечыць 300 мільёнаў чалавек, долар надрукуеце. Але гэта сёння. А што будзе заўтра? Мабыць, Дональд Трамп так прыкінуў, паглядзеў і думае: «Рэзкавата ўзяў, мусіць, трэба (калі гэта трэба) палічыць спачатку, а потым і адступіць». Таму я спакойна за гэтым назіраю. А што будзе далей...» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, Беларусі і Расіі не варта наконт гэтага хвалявацца. Супраць нашых краін ужо столькі санкцый увялі, што далей няма куды. «І мы вытрымалі, мы выдужалі, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — І калі мы гэтым шляхам будзем ісці, не будзем на слова верыць «вы нам 30 дзён цішыні дайце на фронце», «вы нам тое дайце», а ўзамен — нічога, дык якая размова можа быць. Мы не хочам быць чарговы раз падманутымі. Таму шчыра кажу: мяне гэта непакоіць, бо алагічна, гэта ненармальна з пункту гледжання эканомікі. Але з іншага боку, трэба пачакаць, паглядзім, што з гэтага атрымаецца». У сувязі з гэтым Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб важным. «Пакуль нам трэба ўзмацняць сваё», — канстатаваў ён.

«ГЭТА НАШ ГОНАР»

Пагаварылі і пра актуальныя спартыўныя навіны. Самая гучныя цяпер — рэкорд Аляксандра Авечкіна па колькасці закінутых шайб у Нацыянальнай хакейнай лізе. У выхадныя хакеіст «Вашынгтон Кэпіталз» забіў свой 895-ы гол і пабіў 26-гадовы рэкорд канадца Уэйна Грэцкі. Такая падзея па-за ўвагай Аляксандра Лукашэнкі, які сам гуляе ў хакей, застацца не магла. «Авечкін — маладзец. Наш хлопец, рускі чалавек і пабіў рэкорд у НХЛ. Магчыма, камусьці было непрыемна. Яны ж раўнівыя, спартсмены, але паглядзіце, як усе радаваліся гэтаму. Гэта трэба, каб Саша Авечкін, рускі чалавек, павярнуў іх у свой бок. Гэта гонар», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, пераўзысці гэты рэкорд будзе вельмі цяжка, амаль немагчыма. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што Аляксандр Авечкін устанавіў яго амаль у 40 гадоў, а большасць спартсменаў у 27-32 гады стамляюцца і гуляць не могуць. «У 32 гады толькі пачынаць трэба гуляць. Толькі трэба рыхтавацца і выступаць. Вось 40 гадоў хлопец — прыемна паглядзець. І, трэба аддаць належнае, ён жа гуляе. Гэта ж машына», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што сочыць за Авечкіным яшчэ і таму, што ў адной камандзе з ім гуляе беларускі хакеіст Аляксей Протас, які аддаў Авечкіну шмат галявых перадач. «Гэта наш гонар. А я як чалавек, улюбёны ў хакей, не магу не ганарыцца і не радавацца. Малайчына. Я ад душы яго віншую», — падзяліўся Прэзідэнт.

«НЕ БЫВАЦЬ ТАМ, ПРАДСТАЎЛЯЮЧЫ ГЕРАІЧНЫ БЕЛАРУСКІ НАРОД, — БЫЛО Б НЯПРАВІЛЬНА»

Радзік Батыршын заўважыў, што ў Аляксандра Лукашэнкі ёсць традыцыя святкаваць Дзень Перамогі ў Мінску і ў Маскве. Ён пацікавіўся, адкуль яна пайшла. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што гэта традыцыя ўзнікла ў час яго першага візіту ў Маскву ў статусе Прэзідэнта. У той час Прэзідэнтам Расіі быў Барыс Ельцын. «Я заходжу ў пакой, дзе мы сустракаемся. Пасярэдзіне доўгі стол. Я зайшоў з аднаго боку, ён — з другога. І мы стаім насупраць і глядзім адзін на аднаго. Я гляджу, Ельцын такі гераічны, а ў вачах я ўбачыў нейкую разгубленасць. І я хутчэй сарыентаваўся і кажу: «Барыс Мікалаевіч, калі вы думаеце, што я прыехаў у чужую Маскву, то вы памыляецеся, гэта і мая Масква». Барыс Мікалаевіч тут, вядома, «растаў», размова пачалася. Таму гэта і мая Масква. Мы жылі ў той краіне. Першы парад Перамогі прайшоў на Краснай плошчы, заўсёды быў на Краснай плошчы і ў адзінай дзяржаве, і калі мы разышліся па сваіх кватэрах, парады заўсёды праходзілі», — падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. Ён працягнуў, што традыцыю сустракаць Дзень Перамогі ў Маскве заклаў і Уладзімір Пуцін, які запрашае нацыянальных лідараў на парады.

«Мы цвёрда стаялі на тым, што 9 Мая — гэта Дзень Перамогі. І не бываць на Краснай плошчы (нават не таму, што гэта была адзіная Перамога), не бываць там, прадстаўляючы гераічны беларускі народ, — было б няправільна», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. Таму склалася такая традыцыя, што Аляксандр Лукашэнка заўсёды наведвае мерапрыемствы ў Расійскай Федэрацыі, вяртаецца дамоў і вечарам святкуе з беларусамі.

Паводле слоў Прэзідэнта, беларусы любяць гэтыя мерапрыемствы, на іх заўсёды збіраецца шмат людзей.

Беларускі лідар таксама падкрэсліў, што ваенныя парады на Дзень Перамогі або Дзень Незалежнасці — гэта не бразганне зброяй: «Гэта для таго, каб бачылі, што ёсць людзі і зброя, якой мы гатовы абараніць сваю краіну і мірную працу нашых грамадзян».

«МЫ ПАСТАЎЛЯЕМ ДЛЯ ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНЫХ ГАЛІН У РАСІІ СВАЮ ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНУЮ ПРАДУКЦЫЮ»

Старшыня МТРК «Мір» пацікавіўся, што ўжо зроблена і што яшчэ трэба зрабіць для павышэння дабрабыту людзей у дзвюх краінах у рамках Саюзнай дзяржавы. «Хачу нагадаць, што летась Беларусь дасягнула выдатных вынікаў у эканоміцы. Тэмпы росту ў эканоміцы Беларусі былі вышэйшыя, чым у Германіі, больш як 4 працэнты. Цяпер мы бачым у сусветнай эканоміцы велізарную турбулентнасць. Ці атрымаецца захаваць тэмпы росту эканомікі Беларусі сёлета?» — пацікавіўся Радзік Батыршын.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што тэмпы росту застануцца прыкладна такімі ж. Гаворачы аб лічбах, ён заўважыў, што ўвесь час «падрастае база», да якой лічаць працэнты росту. «Да нуля лягчэй прырастаць, чым да 90 %. Таму, натуральна, 4,5 або 5 % ні ў нас, ні ў Расіі ўвесь час быць не можа. Але гэта не страшна. Таму што той працэнт ці два, да якога мы будзем прырастаць у 2027—2030 гадах, будзе больш важкім, чым сённяшнія тры, чатыры ці пяць працэнтаў. Гэта так, калі эканамічна разважаць, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Таму спадзявацца на тое, што ўвесь час будзем расці на 5 %, не даводзіцца. Але вы маеце рацыю, што мы ў 2024 годзе прыраслі больш, чым Германія. І мы пра гэта можам казаць, таму што ў нас не нуль, у нас вельмі высокая была база эканомікі. І нам 4 % дадаць вельмі складана».

Паводле слоў Прэзідэнта, трэба падзякаваць заходнім кампаніям, якія збеглі з расійскага і беларускага рынку. Ён заўважыў, што збеглі з розных абласцей, і вельмі важная з іх — забеспячэнне людзей. «Усё, каб забяспечыць людзей, у Беларусі ў наяўнасці», — запэўніў ён.

Гаворачы пра высокатэхналагічныя вытворчасці, кіраўнік дзяржавы прывёў для прыкладу завод «Інтэграл»: «Толькі Беларусь захавала асновы мікраэлектронікі. І мы сёння запатрабаваны на нашым асноўным рынку і не толькі. Мы захавалі школу, захавалі нашы магчымасці, і гэта дало нам прырост у тым ліку ў эканоміцы, перш за ўсё за кошт расійскага рынку.

Для абароннай зброі, для касмасу, для атамнай станцыі мы вельмі шмат чаго вырабляем. І ў большасці мы пастаўляем для высокатэхналагічных галін у Расіі сваю высокатэхналагічную прадукцыю».

УРАЖАННЕ РАЗМОВЫ З ЭКСПЕРТАМ ПА БОЛЬШАСЦІ ПЫТАННЯЎ

Пасля размовы з Прэзідэнтам у гутарцы са сваімі калегамі **Радзік БАТЫРШЫН** падзяліўся ўражаннямі ад гэтага інтэрв'ю. «Я глыбока ўдзячны Аляксандру Рыгоравічу за тое, што першае пасля ўступлення на пасаду Прэзідэнта інтэрв'ю ён даў нашай тэлекампаніі», — сказаў старшыня МТРК «Мір». Ён расказаў, што ў інтэрв'ю закранулі пытанні эканомікі, бяспекі, меры, якія прымаюцца для таго, каб людзям жылося лепей. «Што ўразіла, дык гэта дэталёвая паглыбленасць кіраўніка дзяржавы ва ўсе эканамічныя і палітычныя пытанні. Гэта датычылася і пытанняў бяспекі ў рамках Саюзнай дзяржавы. Гэта датычылася тых няпростых працэсаў, якія адбываюцца ў свеце. Зразумела, што выбухны характар сітуацыі ў свеце паўплывае на эканоміку не толькі Беларусі, але і іншых краін. Мяне ўразіў спакой Аляксандра Рыгоравіча, які сказаў: «Давайце пакуль панаэіраем». А энцыклапедычныя веды Прэзідэнта аб усіх дэталях і працэсах у мяне як у журналіста пакінулі ўражанне размовы з экспертам па большасці пытанняў», — падсумаваў Радзік Батыршын.

Валерыя СЦЯЦКО.

АФІЦЫЙНА

ГАРАДОЎ-ВЫМПЕЛАНОСЦАЎ СТАЛА БОЛЬШ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 8 красавіка падпісаў Указ № 144 «Аб узнагароджанні вымпелам «За мужнасць і стойкасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Вымпелам узнагароджаны шэсць гарадоў Беларусі, якія з'яўляюцца прыкладам подзвігу і ўсенароднага супраціўлення, праяўленых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод іх — **Кобрын, Рэчыца, Слонім, Сянно, Слаўгарад** і **Смалявічы,** паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У гэтых населеных пунктах на ўсіх этапах вайны дзейнічалі ачагі баявога супраціўлення нямецка-фашысцкім захопнікам, актыўны ўдзел у якім прымалі мясцовае партыйна-камсамольскае і патрыятычнае падполле, партызанскія фарміраванні і сілы народнага апалчэння, якія ўзаемадзейнічалі з часцямі рэгулярнай Чырвонай Арміі.

Гэты ўказ накіраваны на ўвекавечанне і захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа, а таксама патрыятычнае выхаванне насельніцтва.

Уручэнне вымпелаў плануецца прымеркаваць да Дня Перамогі.

Усяго ў Беларусі названай узнагароды ўдастоены 36 гарадоў і населеных пунктаў.

АДБЫЛАСЯ ТЭЛЕФОННАЯ РАЗМОВА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

Уладзімір Пуцін пазваніў Аляксандру Лукашэнку і падзякаваў за затрыманне найбуйнейшай партыі асабліва небяспечнага грузу — узрыўчаткі, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Прэзідэнт Расіі папрасіў перадаць удзячнасць і наколькі магчыма заахвоціць спецыялістаў і экспертаў, якія знайшлі і ідэнтыфікавалі небяспечны груз.

Акрамя таго, кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі маючыя адбыцца сустрэчы, у тым ліку ў канцы красавіка ў Валгаградзе, дамовіўшыся пры сустрэчы падрабязна абмеркаваць актуальныя пытанні супрацоўніцтва і абмяняцца меркаваннямі па шырокім спектры тэм у цэлым.

Таксама ў размове Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін абмеркавалі маючыя адбыцца беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2025» і коратка закранулі сітуацыю ў зоне спецыяльнай ваеннай аперацыі.

Падрабязнасці

СМЯРОТНЫ ГРУЗ

Беларускія мытнікі спынілі ўвоз на тэрыторыю ЕАЭС найбуйнейшай у гісторыі Беларусі партыі ўзрыўчаткі. Пра гэта паведамілі ў Дзяржаўным мытным камітэце.

ПАДОБНАЕ НА ГЕКСАГЕН

580 кілаграмаў асабліва магутнага выбуховага рэчыва замежнай вытворчасці спрабаваў правезці праз беларуска-польскую граніцу і далей транспартаваць у Расію 41-гадовы вадзіцель. Ён рухаўся праз пункт пропуску «Брэст» на транспартным сродку Mercedes. На падставе сістэмы аналізу рызык мытнікі накіравалі аўто на сканіраванне з прымяненнем інспекцыйна-нагляднага комплексу.

На сканаграме ўбачылі нехарактэрныя зацямненні ў вобласці падлогі аўтамабіля, а таксама ў сценцы, якая падзяляе грузавы і пасажырскі адсекі. Далей — паглыблены надгляд, у выніку якога быў зроблены частковы дэмантаж падлогі і сценкі аўтамабіля. Гэтыя месцы аказаліся цалкам напоўнены тоўстым пластом рэчыва.

«Было выяўлена рэчыва светла-шэрага і светла-жоўтага колеру. У далейшым было прынята рашэнне адправіць дадзенае рэчыва ў мытную лабараторыю, дзе ўжо эксперт вызначыў, што яно з'яўляецца небяспечным выбуховым рэчывам на аснове ТЭН (пентаэрытрытэтранітрат. — **Рэд.**), якое па характарыстыках падобнае на гексаген», — паведаміў **начальнік Брэсцкай мытні Сяргей ЯКУТА.**

Як мяркуецца, выбуховае рэчыва спрабавалі схаваць, накрыўшы яго вібрашумаізаляцыйнымі лістамі і лістамі ДСП. Для таго, каб на яго не зрэагавалі службовыя сабакі, унутраныя краі кузава апрацавалі тэхнічнай змазкай. Рэчыва было вынята з прыцягненнем кампетэнтных спецыялістаў.

Кіроўцу затрымалі. У дачыненні да зламысніка і іншых пакуль неўстаноўленых асоб узбуджана крымінальная справа. Мужчыну можа пагражаць да 10 гадоў турмы.

НАДЗЕЙНЫ ШЧЫТ

Беларускія спецыялісты працягваюць сістэмную работу па процідзеянні рэальным пагрозам. З такой заявай выступіла прэс-служба МЗС Беларусі, каментуючы спробу ўвозу ўзрыўчаткі на тэрыторыю краіны.

«Беларуская мытная служба прадухіліла ўвоз на тэрыторыю Саюзнай дзяржавы найбуйнейшай у гісторыі нашай краіны партыі выбуховых рэчываў. Гэта лагічны працяг паслядоўнай і адказнай палітыкі Беларусі па забеспячэнні бяспекі агульнасаюзных граніц. У той час як польскія калегі сканцэнтраваны на пытаннях кантролю за міграцыйнымі патокамі, дэкларуючы стварэнне «самай абароненай граніцы ў Еўропе», беларускія спецыялісты прадаўжаюць сістэмную работу ў процідзеянні рэальным пагрозам. Прычым, як мы бачым, і за сябе, і за польскі бок», — адзначылі ў ведамстве.

У прэс-службе падкрэслілі, што прафесіяналізм і аператыўнасць беларускіх мытных органаў дазволілі не толькі канфіскаваць небяспечныя матэрыялы, але і сарваць патэнцыяльныя планы іх прымянення. «Прадухіленне траплення гэтых матэрыялаў у рукі зламыснікаў выключыла магчымасць рэалізацыі сцэнарыяў, якія маглі прывесці да масавых ахвяр і разбурэнняў. Перамяшчаючыся праз некалькі дзяржаў Усходняй Еўропы, грузавік цудам не стаў бомбай запаволенага дзеяння, пра якую нават не падазравалі жыхары ЕС. Што, калі б выпадковая іскра, ДТЗ ці ўдар маланкі ператварылі злашчасны транзіт у катастрофу?» — задалі рытарычнае пытанне ў міністэрстве.

Як заўважыў у эфіры «Альфа Радыё» **дэкан факультэта журналістыкі БДУ, палітолаг Аляксей БЯЛЯЕЎ**, «Беларусь — гэта сёння такі шчыт, які закрывае заходнія граніцы Расіі, які дапамагае, як фільтр, адсякаць вось такія пагрозы». «І, вядома, гэта прыемна, што нашы адпаведныя службы працуюць добра, — адзначыў Аляксей Бяляеў. — Мы ж перыядычна чуем не толькі аб спробах правозу ўзрыўчаткі, але і ўзбраення, і ўсяго астатняга, аб раскрыцці розных тэрарыстычных груп. Беларускія сілавікі, скажам шчыра, дасягнулі высокага ўзроўню ў выяўленні, прагназаванні і спыненні такіх пагроз».

НАЎМЫСНАЯ ПАМЫЛКА

Перасячэнне польскай мытні грузавіком з узрыўчаткай наўрад ці было выпадковасцю. Такім меркаваннем з БелТА падзяліўся **польскі экс-суддзя Томаш ШМІТ.** «Тое, што аўтамабіль з выбуховым рэчывам праехаў па тэрыторыі Польшчы, магло адбыцца. Праверкі не вельмі дакладныя, і ў цэлым прысутнічае беспарадак. Можна згадаць гісторыю са скрадзенымі ваеннымі процітанкавымі мінамі, якія пазней знайшлі на складзе адной з крам. Інакш арганізавана справа на граніцы з Беларуссю і Расіяй. Там праверкі вельмі сур'ёзныя. Дакладна гэтак жа, як на самім пагранічным пераходзе. Рэнтген аўтамабіля, яго праверка спецыяльна навучанымі сабакамі і некаторыя іншыя метады, якія я не буду раскрываць, з'яўляюцца стандартнымі працэдурамі», — адзначыў Томаш Шміт.

Ён не верыць у тое, што польскія пагранічнікі зрабілі такую памылку і выпадкова прапусцілі машыну з узрыўчаткай. «Можна выказаць меркаванне, што гэта было зроблена наўмысна. Пытанне толькі ў тым, чый гэта быў загад і на якім узроўні яго аддалі. Польскія спецслужбы актыўна супрацоўнічаюць з украінскімі. Пры гэтым узрыўчатка павінна была трапіць на тэрыторыю Расіі», — падкрэсліў польскі экс-суддзя.

Томаш Шміт таксама выказаў меркаванне, што вадзіцель гэтага грузавіка — усяго толькі інструмент, які бязлітасна выкарыстаны польскімі і ўкраінскімі спецслужбамі. «Для гэтых людзей не мае значэння жыццё простых людзей», — рэзюмаваў ён.

Мікалай ЛІТВІНАЎ.

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

ЗАХАВАЦЬ І АБАРАНІЦЬ

У Палаце прадстаўнікоў абмеркавалі падрыхтоўку і правядзенне Міжнароднага патрыятычнага форуму Саюзнай дзяржавы «Вялікая спадчына — агульная будучыня»

Форум, у якім, як плануецца, возьмуць удзел прэзідэнты Беларусі і Расіі, адбудзецца ў канцы красавіка ў Валгаградзе. Колішні Сталінград па праве лічыцца горадам-сімвалам Вялікай Перамогі: тут адбылася легендарная бітва, якая змяніла ход Вялікай Айчыннай вайны. Па колькасці беззваротных страт Сталінградская бітва стала адной з самых крывавых у гісторыі чалавецтва. Тут савецкі народ даказаў усяму свету, што перамагчы яго немагчыма. Аб гэтым, ужо праз 80 гадоў, будуць казаць і нашчадкі пераможцаў, якія свята захоўваюць памяць аб тых падзеях.

Фота БелТА.

У рамках форуму запланавана правядзенне пленарнага пасяджэння, дзвюх секцый. Іх тэмы — «Захаванне і абарона агульнай гістарычнай памяці», «Патрыятычнае выхаванне на аснове гістарычных ведаў». Акрамя таго, на палях форуму адбудзецца пасяджэнне Маладзёжнай палаты пры Парламенцкім Сходзе Саюза Беларусі і Расіі.

Падчас нарады ў Палаце прадстаўнікоў прысутнічалі дэлегаты будучага форуму. Сярод іх — вядучыя гісторыкі нашай краіны, людзі, якія займаюцца пытаннямі патрыятычнага выхавання моладзі. Дэлегатаў праінфармавалі аб праграме форуму, размеркавалі іх удзел па секцыях, вызначыліся з тэматыкай выступленняў.

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА,** ідэя правесці форум нарадзілася падчас правядзення Савета Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. «Мэта форуму — паказаць веліч подзвігу савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны», — акцэнтаваў увагу спікер. Ен падкрэсліў, што гэта не навуковая канферэнцыя, а міжнародны патрыятычны, асветніцкі форум, які носіць больш ідэалагічную скіраванасць.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў канстатаваў, што сёлета святкаванне юбілейнай даты Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне адзначаецца як заўсёды комплексна і арганізавана. «Інакш і быць не можа, паколькі гэта традыцыя стала сапраўды ўсенароднай», — падкрэсліў ён.

Ігар Сергяенка звярнуў увагу прысутных на тое, што дэпутаты Палаты прадстаўнікоў літаральна кожны тыдзень праводзяць работу, накіраваную на захаванне гістарычнай праўды, памяці аб Вялікай Айчыннай вайне, масавым гераізме народа, выхаванне патрыятызму сярод моладзі. У прыватнасці, днямі адбыліся другія парламенцкія чытанні на тэму «Партызанскі рух і падпольная барацьба ў Беларусі: гераізм і стойкасць народа ў імя Перамогі».

Як расказаў у размове з журналістамі **старшыня Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў Генадзь ЛЕПЯШКО,** удзел у форуме возьмуць дэлегацыі амаль з 20 краін. «У складзе беларускай дэлегацыі будуць прадстаўнікі не толькі парламента, але і грамадскіх арганізацый, рэктары вышэйшых навучальных устаноў, прарэктары па ідэалагічнай рабоце, дырэктары гімназій і школ, цэнтраў патрыятычнага выхавання, прадстаўнікі навуковай супольнасці», — канкрэтызаваў ён.

Па словах дэпутата, асноўны пасыл форуму — захаваць і абараніць гістарычную праўду. «Вельмі шмат апошнім часам спроб яе сказіць, — патлумачыў парламентарый. — Практыка паказала: толькі разам мы можам абараніць тую спадчыну, якую перададзім потым нашай моладзі».

Дарэчы, маладыя людзі стануць актыўнымі ўдзельнікамі форуму. Каля 20 чалавек у дэлегацыі з Беларусі — прадстаўнікі Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе.

Вераніка КАНЮТА.

ІНТЭГРАЦЫЯ

УЗАЕМНАЕ ПРАНІКНЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙ

Як развіваецца беларуска-расійскае супрацоўніцтва

Рэфінансаванне крэдытаў будзе аказваць падтрымку нашай фінансавай сістэме. Гэта адзначыў **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЕРСТАЎ** у эфіры тэлеканала «Беларусь 1», гаворачы аб некаторых выніках візіту **прэм'ер-міністра Аляксандра ТУРЧЫНА** ў Расію. «Ёсць яшчэ шмат пытанняў, якія трэба надалей нам развіваць, бо гэты парадак дня не самы просты. Але па асобных пагадненнях дамовіліся аб рэфінансаванні крэдытаў урада Расіі, якія выдзялялі Міністэрству фінансаў раней. Гэта будзе аказваць падтрымку нашай фінансавай сістэме, плацежнаму балансу, але будзем працаваць і далей», — падкрэсліў міністр фінансаў.

Першы намеснік міністра эканомікі Андрэй КАРТУН расказаў аб новых беларуска-расійскіх праектах. «Мы адпрацоўваем яшчэ дзесяць праектаў. З дзесяці восем праектаў два бакі ўзгаднілі. І будзем прапрацоўваць далей узаемнае фінансаванне. Тыя ж самалёты трапляюць у канкрэтную плоскасць. Ёсць узаемнае пранікненне інвестыцый. Тэмп росту эканомікі ў нас практычна адзін у адзін — каля 4 % мы расцём два гады запар узаемна. Тэмп росту ў прамысловасці ў межах 5 %», — распавёў Андрэй Картун.

УРАЖАННІ

«ГЭТА ЭКСКУРСІЯ ДАКЛАДНА ЗАПОМНІЦЦА НАМ НАДОЎГА»

Супрацоўнікі агенцтва «Мінск-Навіны» і Адміністрацыі Прэзідэнта наведалі ўчора Палац Незалежнасці

Гэтым разам галоўную афіцыйную пляцоўку краіны наведалі супрацоўнікі агенцтва «Мінск-Навіны». У ліку гасцей — генеральны дырэктар, яго намеснікі, галоўныя рэдактары, карэспандэнты, SMM-спецыялісты і не толькі. Таксама на экскурсію ў Палац Незалежнасці 8 красавіка прыехалі супрацоўнікі Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дарэчы, рэзідэнцыя Прэзідэнта, якая ніколі не пазіцыянавалася як нейкі адасоблены аб'ект, з'яўляецца часткай мінскага патрыятычнага квартала, дзе размяшчаюцца таксама стэла «Мінск — горад-герой», Музей Вялікай Айчыннай вайны, Парк Перамогі, Вярхоўны Суд, а неўзабаве яго дапоўніць новы Нацыянальны гістарычны музей і Парк народнага адзінства.

Чакаць у чарзе на наведванне рэзідэнцыі Прэзідэнта прыходзіцца даволі працяглы час. Аднак да гэтага ўсе госці ставяцца з разуменнем, бо ведаюць, што тут рэгулярна праходзяць самыя статусныя мерапрыемствы.

Генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-Навіны» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ расказаў, што для работнікаў іх агенцтва Палац Незалежнасці — знакавае месца: «Гэта адзін з сімвалаў беларускага суверэнітэту. Тут праходзілі найважнейшыя палітычныя падзеі, у тым ліку тыя, у якіх я асабіста браў удзел як журналіст. Акрамя таго, тут прымаюцца найважнейшыя рашэнні не толькі для горада Мінска, але і для ўсёй рэспублікі. Думаю, што для калег-журналістаў пабываць тут — вялікі падарунак», — заўважыў Андрэй Яўгенавіч.

Журналіст агенцтва «Мінск-Навіны» Ангеліна АНАНІЧ наведала Палац Незалежнасці ўпершыню. Для дзяўчыны стала прыемным адкрыццём, што рэзідэнцыя Прэзідэнта — не толькі велічнае і статуснае месца, але адначасова і ўтульнае, тут яскрава прасочваецца дух беларусаў: «Сапраўды, некаторы час прыйшлося пачакаць перад тым, каб наведаць галоўную пляцоўку краіны. Мы з захапленнем з калегамі сёння прыехалі ў палац і засталіся вельмі ўражаны маштабам, прыгажосцю. Рада, што ўбачыла яго на свае вочы. Гэтая экскурсія дакладна запомніцца нам надоўга», — адзначыла яна.

Яна ВАЛАСАЧ, фота аўтара.



СОТНІ ТЫСЯЧ ЭЛЕКТРАМАБІЛЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рыхтуюцца папраўкі ва Указ № 92 «Аб стымуляванні выкарыстання электрамабіляў». Пра гэта распавёў **міністр эканомікі Юрый ЧАБАТАР,** які лічыць, што «ўрадам летась актуалізаваная праграма развіцця дзяржаўнай зараднай сеткі ў частцы павелічэння колькасці і магутнасці. Цяпер асноўны фокус — на сетцы павольных зарадак. Яны ў большай ступені запатрабаваны грамадзянамі, асабліва ў спальных раёнах, у месцах стаянак, побач з офісамі і месцамі адпачынку».

МАКСІМАЛЬНАЕ СПРЫЯННЕ

Як адзначыў **начальнік упраўлення базавых галін прамысловасці Міністэрства эканомікі Юрый ІВАНОЎ,** для нашай дзяржавы электрамабілі сталі ўжо неад'емнай часткай паўсядзённага жыцця, што аказвае станоўчы ўплыў і на эканоміку краіны. Ён заўважыў, што адначасова з уводам гэтага транспарту вырашаюцца як экалагічныя, так і эканамічныя задачы. Скарачаецца выкарыстанне выкапнёвага паліва, загружаюцца новыя магутнасці ў энергетыцы і ствараецца новая галіна.

У нас у краіне на сёння колькасць электрамабіляў складае 28,5 тысячы. Пяць гадоў таму іх было ўсяго 80. Паводле яго слоў, толькі летась прырост склаў 14 200 машын, што ў 2,7 раза перавышае паказчык 2023-га.

«І сёлета таксама назіраецца станоўчая дынаміка. За тры месяцы ўжо зарэгістравана каля 5300 новых электракараў. У выніку да канца года прагназуюць, што колькасць электракараў у краіне дасягне 48 тысяч. Ёсць падставы меркаваць, што да 2030 года ў Беларусі будзе зарэгістравана каля 250–300 тысяч электрамабіляў», — дадаў Юрый Іваноў.

Начальнік упраўлення заявіў, што ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы і ўрада ў краіне створаны максімальна спрыяльныя ўмовы павелічэння колькасці электрамабіляў: «Па-першае, гэта льготы і прэферэнцыі. Гаворка ідзе аб вызваленні ад увазнога ПДВ і ПДВ з абаротаў, інвестыцыйны вылік і адсутнасць платы за карыстанне камунальнымі паркоўкамі. Па-другое, устаноўлена нулявая мытная пошліна і сімвалічны памер збору па ўтылізацыі, а таксама магчымасць рухацца па вылучаных палосах».

Акрамя таго, для камфортнай зарадкі электрамабіля ў краіне развіваецца сетка спецыяльных АЗС. На сёння іх ужо налічваецца каля 1400 станцый. Калі на пачатак мінулага года на адну зарадную прыладу прыпадала 8,8 электрамабіля, то за год гэтыя суадносіны фактычна падвоіліся і склалі 16,8 машыны. Аптымальным у свеце лічыцца 11-12 электрамабіляў. Па гэтым паказчыку наша краіна не адстае ад лідараў і ўваходзіць у топ-15 сусветных краін, адзначыў прадстаўнік Мінэканомікі.

АД ВЕЛЬМІ ХУТКІХ ДА ПРОСТЫХ І ПАВОЛЬНЫХ

Намеснік генеральнага дырэктара па будаўніцтве і агульных пытаннях РУП «Вытворчае аб'яднанне» Беларуснафта» Андрэй КОЦІК лічыць, што адбываецца транспартная рэвалюцыя, ключавым драйверам якой стаў імклівы рост электратранспарту. Сёлета ў свеце кожны пяты прададзены аўтамабіль быў электрычным, паводле прагнозаў, да 2030 года будзе кожны другі. Доля электрамабіляў у трафіку ў свеце ў 2030-м складзе каля 20 %.

Развіццё электрамабільнага транспарту ў Беларусі з'яўляецца адным з ключавых кірункаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. У рамках Указа Прэзідэнта № 92 «Аб стымуляванні выкарыстання электрамабіляў» у Беларусі створана ўнікальная заканадаўчая база для паўсюднага стымулявання выкарыстання электрамабіляў і развіцця зараднай інфраструктуры. Электрамабілі, пры поўным замяшчэнні аўтатранспарту ў Беларусі, валодаюць патэнцыялам спажывання 24 мільярдаў кВт/г за год, што супастаўна з магутнасцю ўсёй БелАЭС. Патэнцыял да 2030 года — больш за 300 тысяч электрамабіляў на дарогах Беларусі і 1,5 мільярда кВт/г за год спажыванне электраэнергіі.

Гэта стала магчымым дзякуючы высокай эфектыўнасці электрамабіляў, якія ўжо танней за аўтамабілі з рухавіком унутранага згарання, а таксама дзякуючы стварэнню дзяржаўнай базавай зараднай інфраструктуры, што дазваляе бесперашкодна перамяшчацца па ўсёй тэрыторыі краіны.

ПАСКАРЭННЕ ІНІЦЫЯТЫВЫ

Мінэканомікі рэалізавала ўсе неабходныя заканадаўчыя ініцыятывы для паспяховага дасягнення намечаных мэт. Унікальнасць заканадаўства Беларусі ў сферы ўстаноўкі зарадных станцый адзначаюць нават прадстаўнікі замежных дзяржаў і кампаній: у Беларусі магчыма ўсталяваць зарадную станцыю ў любым пункце без выдзялення зямельных участкаў, прадугледжана абавязковае стварэнне базавай зараднай сеткі.

Развіццё тэхналогій дазваляе сцвярджаць, што на трасах і ў месцах з вялікімі транспартнымі патокамі зарадная інфраструктура будзе аналагам АЗС па форме аказання паслуг і хуткасці зарадкі. Дзяржаўны аператар забяспечвае стварэнне базавай звышхуткай зараднай інфраструктуры, але ёсць сегмент павольнай зараднай інфраструктуры, які па меры насычэння гарадоў электрамабілямі да 2030 года зойме 30 % рынку.

Для дасягнення гэтай мэты маецца ўся неабходная прагрэсіўная заканадаўчая база. На першы погляд павольная зарадная станцыя — гэта простая прылада, спецыяльная разетка. Аднак гэта не зусім так. Пры ўсёй прастаце адміністрацыйнага працэсу і тэхналогіі ў краіне адсутнічае інтэнсіўнае развіццё павольнай зараднай інфраструктуры з-за шэрагу праблем.

Дзяржаўны партал па ўстаноўцы зарадных станцый — новы падыход і паскарэнне: ад паспяховай нарматыўнай ініцыятывы да практыкі рэалізацыі. Дзяржпартал установкі зарадных станцый распрацаваны Міністэрствам эканомікі сумесна з дзяржаўным аператарам зараднай інфраструктуры ў мэтах павышэння эфектыўнасці прынятых заканадаўчых мер па стымуляванні развіцця зараднай інфраструктуры.

На гэтай лічбавай платформе прадстаўлены алгарытм праходжання працэдур: ад падачы заяўкі да першай зарадкі. Прадугледжаны мінімальны ўдзел бізнесу ў працэсе атрымання дазволаў, праектавання і будаўніцтва. «Упэўнены, што гэта інфармацыя дапаможа ініцыятыўным прадпрымальнікам зайсці на рынак зараднай інфраструктуры, а вопытным гульцам — маштабаваць сваю справу і рэалізоўваць новыя інфраструктурныя праекты», — падсумаваў Юрый Чабатар.

Сяргей КУРКАЧ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.



КОЖНЫ ТРЭЦІ. НЕЛЬГА ЗАБЫЦЬ

Канцэрт-рэквіем «Кожны трэці», які праходзіць на гэтым тыдні штодня ў Палацы Рэспублікі, убачаць прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў Беларусі. У панядзелак вечарам яго паглядзелі прадстаўнікі Віцебшчыны — славутага партызанскага краю, радзімы легендарных Канстанціна Заслонава і Бацькі Міная і месца гераічнай аперацыі «Прарыў» супраць фашысцкай блакады.

Аляксандр СУБОЦІН, старшыня Віцебскага аблвыканкама, нагадаў, што Віцебшчына за Перамогу заплаціла дарагую цану: «Віцебск, які меў да вайны 180 тысяч жыхароў і з'яўляўся адным з цэнтраў прамысловай вытворчасці ў СССР, пасля вайны быў разбураны на 93 %. Са 180 тысяч жыхароў сустракаць вызваліцеляў выйшла ўсяго 118 чалавек. У нашай вобласці ў кожным рэгіёне былі спалены сотні вёсак, многія з якіх не былі адноўлены і праз 80 гадоў там засталіся ў асноўным лясныя масівы».

Цяпер у Віцебскай вобласці пражывае 107 ветэранаў, расказаў Аляксандр Субоцін. «Іх подзвіг не мае тэрміну даўнасці. Яны з'яўляюцца жывым прыкладам таго, як трэба самаахвярна служыць Радзіме. Яны — духоўны камертон і паказчык здароўя нашай нацыі. Мы гаворым ім дзякуй за тое, што мы ёсць, і за тое, што маем такую выдатную краіну. Азіраючыся назад, мы разумеем, што толькі разам, аб'яднаўшыся, савецкі народ перамог карычневую чуму. Толькі разам мы аднавілі нашу краіну. І разумеем, што толькі разам мы здолелі пабудаваць сучасную Беларусь. І толькі разам мы зможам далей ствараць і супрацьстаяць усім выклікам і пошасцям і перадаць усё дасягнутае намі дзецям і ўнукам», — падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

Пасля канцэрта-рэквіема ў зале не было абыякавых людзей. Пад уражаннем былі і гледачы ў зале, і артысты, якія выходзілі на сцэну. Зрэшты, няхай яны скажуць пра гэта самі.

Дзмітрый ТАКМАКОЎ, мастацкі кіраўнік і саліст мужчынскага хору «Усіхсвяцкі»:

«Гэта праект, калі мужчыны плачуць. Мужчыны плачуць і на сцэне, і ў зале. У нашым ДНК ужо закладзена памяць болю, страху і пульсуючай крыві. Пастаноўка такога канцэрта — гістарычная падзея. На маю думку, гэта самы жывы і самы адухоўлены патрыятызм ва ўсёй яго праяве. Можна вельмі шмат казаць аб любові да Радзімы, да сваёй зямлі. Але калі ты гадзіну з невялікім праводзіш у гэтай зале і цалкам паглыбляешся ў атмасферу страху, жаху і болі, ты відавочна ўсёй душой і ўсім сэрцам разумееш сваю гісторыю. Ты разумееш, для чаго была ахвяра нашых продкаў».

Ірына АГАРОДНІКАВА, намеснік начальніка Полацкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі «Белпошта»:

«Увесь канцэрт мы прапусцілі праз сябе. Тым больш што мой дзядуля прайшоў усю вайну. Канцэрт вельмі кранальны. Яго трэба паказваць, асабліва нашым дзецям. Паказваць, каб яны ведалі, якой цаной дасталася ім жыццё».

Вікторыя АЛЕШКА, заслужаная артыстка Беларусі:

«Кожны раз перад тым, як выйсці на сцэну, я чую словы, якія кранаюць да глыбіні душы. І я з клубком у горле выходжу на сцэну. Я абсалютна нічога не магу з гэтым зрабіць, таму што тэма такая. Яна не можа не кранаць».

Іна ЗАДРОЎСКАЯ, загадчыца дзіцячага садка (Наваполацк):

«У мяне да гэтага часу ў грудзях стукае набат. Гэта фраза «кожны трэці»... Немагчыма ўсвядоміць яе без слёз. Жудасна чуць і бачыць пералічэнні тысяч спаленых вёсак... Мы не можам гэта забыць. Проста не маем на гэта права. Нашы дзеці павінны жыць у мірнай і шчаслівай краіне».

Ганна БЛАГАВА, спявачка і кампазітар:

«Для мяне канцэрт «Кожны трэці» — унікальны праект. Я лічу, што стваральнікі рэквіема — сапраўдныя героі нашага часу. У наш няпросты час, калі Захад спрабуе перакроіць гісторыю, напісаць яе нанова, пад свой фармат, мы, беларусы, імкнёмся абараніць гістарычную праўду. Асабліва важна перадаваць сямейныя гісторыі.

Анатоль СІЎКО, член Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў:

«Кожны нумар праграмы крануў да глыбіні душы. Гэта не проста даніна памяці, а важны напамін пра тое, што мы павінны берагчы і перадаваць памяць аб подзвігу нашых продкаў. Музыка, словы і эмоцыі, якія мы перажылі, прымушаюць задумацца, як важна захоўваць гісторыю і памятаць аб ахвярах вайны. Я ганаруся тым, што ў нашай краіне праводзяцца такія мерапрыемствы, якія аб'ядноўваюць людзей розных пакаленняў. Гэта дазваляе нам не толькі ўшанаваць памяць загінулых, але і ўмацаваць нашу сувязь з гісторыяй і культурай. Канцэрт стаў сімвалам адзінства і сілы нашага народа, і я спадзяюся, што падобныя ініцыятывы будуць працягвацца ў будучыні. Мы абавязаны зрабіць усё магчымае, каб памяць аб героях вайны жыла ў сэрцах нашых дзяцей і ўнукаў».

Фота БелТА.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
9 красавіка 2025 г. № 13 (794)

СУБОТНІК ПА ЗАКЛІКУ СЭРЦА

Фота БелТА.

12 красавіка ўся краіна выйдзе на Рэспубліканскі суботнік. Як правіла, праходзіць ён масава, арганізавана, рэзультатыўна. Людзі працуюць з ахвотай: талака — наша, беларускае слова, а навесці парадак, зрабіць месца, дзе жывеш, прыгажэйшым, можна сказаць, — нацыянальная традыцыя.

Таму многія, акрамя ўдзелу ў важным мерапрыемстве рэспубліканскага маштабу, ладзяць, вобразна кажучы, суботнікі па закліку сэрца. Дзякуючы нераўнадушным энтузіястам, збіраюцца самі, працуюць разам, робяць сваю радзіму чыстай і ўтульнай. І так па ўсёй краіне, у чым і пераканаліся нашы карэспандэнты.

ПРАЦУЕ ДА 100 ЧАЛАВЕК

Старшыню Папінскага сельскага Савета Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці Святлану ДЫШКО застаць у кабінеце аказалася справай няпростай. Вось і гэтым разам яна адказала на званок, адставіўшы ўбок граблі:

— Вясна, настрой рабочы, стараемся максімальна выкарыстаць пагодныя дні, — гаворыць старшыня. — Сёння (4 красавіка. — **Аўт.**) у Новай Папіне працуе каля 100 чалавек. Прыбіраем, фарбуем, упрыгожваем. Нядаўна паставілі новую агароджу на могілках, устанавілі некалькі лавак у цэнтральнай частцы вёскі. Усё набыта за кошт сабраных грамадзянамі сродкаў. На сумесную працу выходзяць і пенсіянеры, і маладзейшыя. Мы любім сваю малую радзіму і хочам сустрэць вясновыя святы ў прыгожай вёсцы. З пачатку сезона ў населеных пунктах сельсавета ўжо прайшло 16 суботнікаў.

Яшчэ кіраўнік мясцовай улады расказала пра вёску Зарэчка. Паводле яе слоў, дзейнасць жыхароў Зарэчкі — прыклад сапраўднага вясковага самакіравання. Людзі збіраюцца на сход, прымаюць рашэнне і агульнымі намаганнямі ўвасабляюць яго ў жыццё. Пачалося з таго, што паўтара дзясятка гадоў таму жыхары Зарэчкі зрабілі значную агульную справу — талакой узвялі невялікую царкву-капліцу.

Паводле назірання старшыні, гэта вёска вызначаецца не толькі працавітасцю, адказнасцю людзей, тут ёсць касцяк актывістаў, якія могуць падаць прыклад. Некалькі гадоў таму на агульным сходзе вырашылі могілкі прывесці ў парадак. Пасля сходу жаночая суполка актывістаў занялася зборам грошай. Прайсці па вёсцы, сабраць узносы сярод жыхароў аказалася самым лёгкім. З дапамогай сельвыканкама знаходзілі нумары тэлефонаў землякоў, якія жывуць у розных гарадах, чые бацькі пахаваны на могілках. Адгукалася пераважная большасць. Адным словам, патрэбную суму сабралі і купілі матэрыялы на першую палову агароджы. Потым такім жа чынам зрабілі і другую частку.

Праўда, давялося наняць арганізацыю і знесці больш за пяць соцень дрэў. Некаторыя былі літаральна ў тры абхваты. Альпіністы дрэвы папілавалі ды пакінулі іх на месцы. Усё гэта патрабавалася ачысціць ад галля, вывезці, прыбраць — таксама вялікая работа — потым спаліць, ачысціць тэрыторыю ад зараснікаў і хмызняку. У працэсе работы знайшлі шмат раней забытых магіл — партызан, мірных жыхароў, якія загінулі падчас вайны. Гэтыя пахаванні ўжо, відаць, няма каму даглядаць, вяскоўцы іх акультурылі, крыжы паднавілі. «Цяпер і школьнікі прыходзяць дапамагчы, трэба ж падтрымліваць, каб па-людску ўсё было. Адным словам, недагледжаных магіл мы не пакідаем, перад святам усё прыбіраем», — гаворыць старшыня сельвыканкама і дадае, што ў Зарэчцы і сёлета ўжо наведзены вясновы парадак.

САМІ З РУКАМІ

А ў сталіцы да добраўпарадкавання далучаюцца Калегіяльныя органы тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання (КОТГС).

— Часцей за ўсё менавіта мы выступаем як ініцыятары ў пытаннях навядзення парадку на зямлі, — расказвае **старшыня 120-га КОТГСа Кастрычніцкага раёна Мінска Алег БРАШКО.** — Трэба разумець, што камунальнікам прасачыць за абсалютна кожным домам, пад'ездам — вельмі цяжка. Мы ж непасрэдна жывём на гэтых тэрыторыях і бачым усе нюансы, якія хвалююць людзей. У ходзе штодзённага маніторынгу тэрыторыі выяўляем самыя розныя праблемы. Гэта, напрыклад, яма на дарозе, зламаная лавачка каля пад'езда... Пры гэтым многія такія праблемы мы, члены КОТГСа, закрываем уласнымі сіламі.

Суботнікі — звычайная справа для мінчан. «Прычым мы праводзім іх не таму, што так трэба або нас абавязалі. Не! Мы праводзім суботнікі таму, што самі хочам, каб вакол нашых дамоў было чыста і дагледжана. Упэўнены, што абсалютна кожны чалавек хоча жыць у прыгожым раёне. Таму на штомесячным пасяджэнні КОТГСа мы вызначаем дзень, калі правядзём чарговы суботнік. Вядома, 12 красавіка зноў выйдзем на вуліцы. Але пры гэтым ужо правялі суботнік 5 красавіка. Тады вакол нашага КОТГСа і на прылеглых тэрыторыях мы навялі сапраўдны парадак. Варта адзначыць, што кожны з членаў КОТГСа пры гэтым з'яўляецца і старшым па пад'ездзе альбо па двары. Такім чынам, праз старшых па пад'ездзе мы і агітуем людзей выходзіць на вуліцу для таго, каб навесці парадак на сваёй зямлі», — расказвае Алег Брашко.

Пры гэтым, дадаў Алег Брашко, заўсёды ўдзяляем увагу ліквідацыі нейкіх недахопаў, рамонту лавак і іншага: «Бо суботнік — гэта не проста прыйшоў, нешта там падмёў і прыбраў лісце. Суботнік — комплексны падыход да добраўпарадкавання, калі кожны чалавек наводзіць парадак не таму, што яму загадалі, а таму, што ён сам гэтага хоча, робіць гэта ахвотна, якасна, з душой. І заўсёды прыемна, калі ты прыходзіш дадому пасля асноўнай работы і бачыш, што ўсюды чыста. Ды і нездарма ж кажуць, што Беларусь — самая чыстая краіна з ліку былых саюзных рэспублік. Менавіта таму мы і агітуем людзей выходзіць на такія суботнікі, дзесьці падмесці, дзесьці нешта падфарбаваць — зрабіць наш двор, нашу вуліцу яшчэ лепшай».

Старшыня 120-га КОТГСа Кастрычніцкага раёна сталіцы прызнаўся, што ў іх існуе пэўная праблема: «Мы не фінансавая арганізацыя, у нас няма ні свайго рахунку, ні прыборачнага інвентару. Таму пры арганізацыі суботнікаў звяртаемся ў мясцовыя жыллёва-камунальныя службы. На шчасце, яны ахвотна ідуць нам насустрач, выдзяляюць прыборачны інвентар і, што самае прыемнае, напрыканцы работ высылаюць трактар, які дапамагае прыбраць усё смецце. Пасля кожнага такога суботніка на нашых вуліцах становіцца вельмі прыгожа. Ды і людзі імкнуцца менш смеціць там, дзе нядаўна самі наводзілі парадак».

ДАГЛЕДЖАНАЯ ПАМЯЦЬ

Могілкі ў вёсцы Шэйпічы Асіповіцкага раёна Магілёўшчыны старадаўнія, але выглядаюць вельмі прывабна. Нядаўна тут паставілі новаю агароджу — абнеслі тэрыторыю брусам. У тым, што на вясковых могілках чысціня і парадак, перадусім заслуга жыхароў, якія вельмі трапятліва ставяцца да памяці сваіх продкаў. І ў гэтым яны плённа супрацоўнічаюць з мясцовай уладай. Атрымліваецца вельмі эфектыўна.

Нядаўна на шэйпіцкіх могілках з'явіўся помнік землякам, якія загінулі падчас вайны. Гэта ўдзячная памяць жыхароў, якія ўсе работы па вырабе і ўстаноўцы помніка ўзялі на сябе.

— На адкрыццё сабралася шмат вяскоўцаў, прысутнічаў мясцовы бацюшка, які асвяціў помнік, — расказвае **старшыня Свіслацкага сельсавета Аляксей ТРАЦЦЯКОЎ.** — Ініцыятарам выступіла стараста вёскі Валянціна Бурак. Яна заўсёды на прамой сувязі з насельніцтвам. Шмат чаго зроблена для камфорту жыхароў па яе зваротах.

Перад Вялікаднем на могілках шчыруюць і камунальнікі, і дэпутаты, і насельніцтва. Жыхары прыходзяць са сваім інвентаром, працуюць на сумленне.

— У мяне таксама ў машыне заўсёды ляжаць рабочыя пальчаткі, — усміхаецца Аляксей Траццякоў. — Ніколі не ведаеш, дзе спатрэбіцца дапамога. Вясной наогул работы шмат. У тым ліку на могілках. Падалі заяўку на пясок, каб людзі маглі месцы пахаванняў сваіх родных асвяжыць. У Асіповічах няма пясчанага кар'ера, таму трэба вырашаць пытанне загадзя. І пра вываз смецця, якога ў дні такіх вось народных суботнікаў збіраецца асабліва шмат, паклапаціліся. Асабліва турбуюць штучныя кветкі, якія народ ахапкамі прыносіць на Радаўніцу. Мы нагадваем, што яны вельмі небяспечныя для экалогіі, але кожны год усё паўтараецца. Нешта трэба рабіць з гэтым, кардынальна мяняць сітуацыю.

У Асіповіцкім раёне дэпутаты знайшлі цікавы спосаб плённага супрацоўніцтва з камунальнікамі па замене агароджаў.

— Прапаноўваем людзям, якія нешта ўмеюць сваімі рукамі рабіць, папрацаваць, — расказвае старшыня сельсавета. — ЖКГ робіць калькуляцыю, колькі каштуюць работы па замене агароджы, дае матэрыял, а нашы людзі самі ўсё робяць і атрымліваюць пры гэтым капейку. І ЖКГ не адрывае ад работы сваіх людзей, і мясцовыя ўдзельнічаюць у добрай справе, і сельсавету добра, што парадак наведзены.

У ГОНАР ГЕРОЯЎ-ВЫЗВАЛІЦЕЛЯЎ

Тэрыторыя Крынкаўскага сельскага Савета Лёзненскага раёна Віцебшчыны даволі вялікая — 38 населеных пунктаў, у дзесяці з іх пражывае да пяці чалавек. Працягласць па перыметры складае 122 кіламетры. Навесці парадак у адзіночку, прызнаецца **старшыня сельсавета Людміла ІВАНОВА,** немагчыма, аднак у кожнай вёсцы ёсць неабыякавыя да сваёй радзімы людзі. Яны і імкнуцца па поклічы сэрца зрабіць свой населены пункт лепшым пастаянна, не толькі ў Год добраўпарадкавання.

Вялікую дапамогу кіраўніку сельсавета ў арганізацыі людзей на добрыя справы аказваюць старэйшыны вёсак. Так, у Высачанах добра ведаюць актыўную Святлану Курэкаву, яна рэгулярна згуртоўвае аднавяскоўцаў на суботнікі. У Крынках жыве Фаіна Сучкова, якая арганізоўвае людзей на прыборку воінскіх пахаванняў і ўдзел у спартыўных спаборніцтвах. У вёсцы Іванькова есць Таццяна Бондарава, якая змагла арганізаваць у населеным пункце збор смецця, актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні месцаў воінскай славы. І такіх прыкладаў у Крынкаўскім сельсавеце шмат.

Асаблівую ўвагу дэпутацкі корпус, установы і арганізацыі сельсавета аддаюць захаванню гістарычнай памяці. І нездарма, бо на ўліку ў Крынкаўскім сельсавеце знаходзяцца 12 воінскіх пахаванняў і 5 мемарыяльных комплексаў. Тут здзейсніла свой подзвіг Герой Савецкага Саюза танкіст Марыя Акцябрская, помнік ёй усталяваны насупраць адміністрацыйнага будынка сельсавета. Воінскае пахаванне клапатліва даглядаюць школьнікі, а Людміла Іванова вядзе работу па пошуку інвестараў, якія дапамагаюць праводзіць рэканструкцыю старых месцаў воінскай славы.

Святлана ЯСКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Информация ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2024 год

№ п/п	Наименование показателей	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тыс. руб.	415 705	285 519
2	Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	тыс. руб.	399 395	276 119
3	Прибыль (убыток) до налогообложения, всего (прибыль (убыток) отчетного периода)	тыс. руб.	13 340	7 348
3.1	в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тыс. руб.	16 310	9 400
3.2	прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тыс. руб.	-3 911	-2 219
3.3	прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	тыс. руб.	941	167
4	Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тыс. руб.	3 353	2 059
5	Чистая прибыль	тыс. руб.	9 987	5 289
6	Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	тыс. руб.	32 154	23 369
7	Долгосрочная дебиторская задолженность	тыс. руб.	0	99
8	Долгосрочные обязательства	тыс. руб.	1 238	831
9	Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде, всего	тыс. руб.	2 125,20	1 176,80
10	Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тыс. руб.	1 176,80	832,20
11	дивиденды на одну акцию, начисленные в данном отчетном периоде	руб.	2,423225197	1,341827316
12	Количество простых (обыкновенных) акций, находящихся на балансе Общества	штук	0	0
13	Количество акционеров, всего	лиц	2 370	2 364
	в том числе			
13.1	юридических лиц	лиц	1	1
13.2	физических лиц	лиц	2369	2 363
14	Среднесписочная численность работающих	лиц	2 085	1 854
15	Обеспеченность акции имуществом Общества	руб.	54,18	42,14

Доля государства в уставном фонде эмитента составляет 51,30 %.

Основной вид деятельности, по которому получено двадцать и более процентов выручки от реализации продукции, работ, услуг, — строительство.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2024 год, – 31 марта 2025 г.

Проверка достоверности годовой бухгалтерской и финансовой отчетности ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» за 2024 год проведена ООО «АСБ Консалт».

Размер дивидендов на одну акцию составляет 2,423225197 рубля.

Выплата дивидендов на акции, принадлежащие физическим лицам, будет перечислена на лицевые счета ОАО «СберБанк», а также произведена посредством почтовых переводов РУП «Белпочта» и выдача в кассах филиалов Общества не позднее 30.05.2025.

Выплата дивидендов на акции, находящиеся в собственности г. Минска, будет перечислена в бюджет г. Минска не позднее 22.04.2025.

Адрес официального сайта ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» в глобальной компьютерной сети **http://stroytrest4.by**

Справки по тел. **+375173112033.**

УНП 100055368

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by
Продавец	ООО «БИП-С Плюс», г. Минск, ул. Короля, дом 3, к. 41в. УНП 190575262
Предмет электронных торгов	
Административно-хозяйственное помещение (административное помещение), инв. № 160/D-9672, общ. пл. 692,9 м², по адресу: ***Брестская обл., г. Пружаны, ул. Октябрьская, д. 104-1***	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 39 300,00 долл. США*	
**Примечание: цена продажи Предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах электронных торгов в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения электронных торгов*	
Задаток 5 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 37853186500, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов	
Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение опубликовано в газете Звязда от 14.02.2025 г.	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: **21.04.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 18.04.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

МОЛАДЗІ — УВАГА АСАБЛІВАЯ

Член Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ігар Луцкі прыняў удзел у пасяджэнні Пастаяннай камісіі Міжпарламенцкай Асамблеі СНД па сацыяльнай палітыцы і правах чалавека. Удзел у пасяджэнні прынялі парламентарыі васьмі краін Садружнасці, эксперты, прадстаўнікі профільных ведамстваў, міжнародных і грамадскіх арганізацый, акадэмічнай супольнасці і прафсаюзных арганізацый. Члены камісіі адобрылі праект мадэльнага закона «Аб лекавым забеспячэнні ў краінах СНД». Яшчэ адзін адобраны дакумент — праект Гласарыя тэрмінаў і паняццяў у галіне маладзёжнай палітыкі.

***

У Наваполацку стартаваў ваенна-патрыятычны квэст «Код памяці» ад Маладзёжнага савета пры Савеце Рэспублікі. Праект будзе рэалізаваны ва ўсіх рэгіёнах краіны. «Гэтым праектам нам хацелася яшчэ раз прыцягнуць увагу школьнікаў да тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Квэст «Код памяці» — гэта не проста гульня, а даніна павагі тым, хто змагаўся за нашу свабоду і незалежнасць, хто аддаў жыццё за мірнае неба. Наша памяць — гэта мост паміж мінулым і будучыняй. І пакуль мы памятаем, подзвіг пераможцаў жывы», — падкрэсліла старшыня камісіі па эканоміцы, інавацыйным развіцці і прадпрымальніцтве Маладзёжнага савета пры Савеце Рэспублікі Алена Круглікава.

Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.

«САМАЕ ГАЛОЎНАЕ — ВЫСЛУХАЦЬ І ПАЧУЦЬ ЧАЛАВЕКА»

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

Дэпутат Таццяна ЛАЎРЫНОВІЧ — пра работу з выбаршчыкамі

Да выбрання дэпутатам Палаты прадстаўнікоў член Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Таццяна Лаўрыновіч жыла і працавала ў Лагойску. Пачынала звычайнай настаўніцай, затым — старшынёй Лагойскага сельвыканкама. «Адпаведна, практычна трэць акругі мне ўжо была знаёмая, — прызнаецца яна. — Маю 75-ю Лагойскую выбарчую акругу па колькасці насельніцтва можна падзяліць на тры ўмоўныя часткі: горад Лагойск і шэсць сельвыканкамаў, горад Смалявічы і два сельвыканкамы, а таксама два сельвыканкамы Мінскага раёна, уключаючы буйны населены пункт Калодзішчы. Такая адміністрацыйная раскіданасць тэрыторыі ўносіць свае карэктывы ў працу і робіць яе цікавай і насычанай на падзеі». Чым сёння жыве 75-я Лагойская акруга, дэпутат расказала карэспандэнту «Звязды».

Таццяна Уладзіміраўна адзначае, што ёй вельмі дапамагае досвед работы ў сельсавеце. «Важна разумець, што акрамя заканатворчасці адным з асноўных кірункаў дзейнасці дэпутата Палаты прадстаўнікоў з'яўляецца работа са зваротамі грамадзян. Досвед работы старшынёй сельсавета паказаў, наколькі гэта важна. Мы павінны былі пачуць людзей, выслухаць, зразумець і дапамагчы ў рэалізацыі задуманага».

Пытаюся ў дэпутата, з якімі пытаннямі і праблемамі звяртаюцца да яе выбаршчыкі.

«Людзі прыходзяць розныя, — адказвае Таццяна Уладзіміраўна. — Ёсць неабыякавыя грамадзяне, якія агучваюць моманты, вартыя ўвагі, і якія патрабуюць дапамогі ў іх вырашэнні. Ёсць і тыя, хто жыве па прынцыпе «мне ўсе павінны». Гэта, як правіла, пастаянныя скаржнікі. Такім даецца асобнае тлумачэнне. Але ў цэлым хацелася б адзначыць добразычлівасць нашых людзей, іх разуменне любых сітуацый, іх цярпенне, а таксама жаданне зрабіць усё, каб нашы гарады і вёскі сталі чысцейшымі і прыгажэйшымі».

На прыёмы людзі прыходзяць з самымі рознымі просьбамі, расказвае Таццяна Лаўрыновіч. У асноўным, як і ўсюды, прыходзяць са звычайнымі жыццёвымі пытаннямі. «Часам прыходзяць толькі для таго, каб проста пагаварыць, быць пачутымі. Вельмі хацелася б, каб людзі часцей прыходзілі на прыёмы з пытаннямі заканатворчасці, унясення змяненняў у заканадаўчыя акты, каб можна было пазнаёміцца з практыкай прымянення заканадаўства і ўзяць, як кажа наш Прэзідэнт, законы ад жыцця», — гаворыць дэпутат. Зрэшты, такія звароты таксама ёсць.

«Так, напрыклад, разам з Лагойскай раённай газетай «Родны край» мы праводзім так званую «Дэпутацкую гадзіну», падчас якой раскрываем якую-небудзь надзённую тэму, — дзеліцца дэпутат. — Адзін раз правялі такое мерапрыемства ў сакавіку, яно было прымеркавана да Дня Канстытуцыі. У красавіку плануем закрануць тэму зямельнага заканадаўства. Раёнка анансуе «Дэпутацкую гадзіну» на пэўную тэму, заклікае людзей выказаць свае заўвагі і прапановы. І да мяне сапраўды прыходзілі людзі, аднак яны ў першую чаргу задавалі надзённае пытанне, якое ўласціва спецыфіцы Мінскага, Лагойскага і Смалявіцкага раёнаў — тых рэгіёнаў, якія недалёка ад сталіцы. Гэта кошт квадратнага метра. Гаворка аб набыцці не толькі ў прыватную ўласнасць. Сам па сабе кадастравы кошт вельмі дарагі. І атрымліваецца, каб ім легалізаваць самавольна занятыя зямельныя ўчасткі, трэба ўнесці вялікую суму, асабліва калі гэты ўчастак з'яўляецца прыватнай уласнасцю. Тады, атрымліваецца, неабходна двайная аплата. З дазволу выканкамаў для людзей магчыма толькі невялікая растэрміноўка. Калі яе і даюць, на жаль, не ўсе нашы грамадзяне, асабліва пенсіянераў узросту, могуць пацягнуць гэту планку: для многіх яна досыць высокая...

— Работа ў акрузе — не толькі прыём грамадзян і прамыя лініі...

— Я стараюся бываць у калектывах, наведваць прадпрыемствы, якія выпускаюць унікальную прадукцыю па ўласных распрацоўках. У якасці апошняга прыкладу прывяду наведванне ТАА «Дорэлектрамаш» Смалявіцкага раёна. Яго ўзначальвае выдатны кіраўнік, які стварыў усё з нуля з невялікай групай аднадумцаў. Цяпер гэта калектыў колькасцю каля 600 чалавек, які ўключае шэсць профільных прадпрыемстваў, мае сваё канструктарскае бюро. Дзякуючы ўмелай кадравай палітыцы тут практычна няма цякучасці работнікаў, а наяўныя вакансіі запаўняюцца вельмі хутка.

Асабліва люблю працаваць у школах. Я па адукацыі педагог, у свой час скончыла геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. І першым маім працоўным месцам стала родная Касінская сярэдняя школа на Лагойшчыне... На такіх сустрэчах мы ўздымаем самыя розныя, актуальныя для нашай краіны і нашага грамадства тэмы. У такой, можна сказаць, нефармальнай абстаноўцы дзеці могуць задаць абсалютна любыя пытанні, прычым менавіта тыя, якія ім насамрэч цікавыя.

— Не менш важным кірункам дзейнасці дэпутатаў з'яўляецца і работа на навядзенні парадку. Гэта асабліва важна сёння, у абвешчаны кіраўніком дзяржавы Год добраўпарадкавання, а таксама перад вялікім святам — юбілеем Перамогі...

— Тут хацелася б адзначыць павялічаную актыўнасць мясцовых жыхароў акругі па добраўпарадкаванні не толькі сваіх падворкаў, але і месцаў агульнага карыстання, ачыстцы сажалак, высечцы старых дрэў і стварэнні зон адпачынку, уладкаванні дзіцячых пляцовак. Пры гэтым усялякую дапамогу і садзейнічанне аказваюць жыллёва-камунальныя службы. А ініцыятарамі і агітатарамі выступаюць старшыні сельвыканкамаў. Яны ўсяляк падтрымліваюць падобныя пачынанні.

Ды і мы, дэпутаты, бяром у гэтым дзейсны ўдзел. Так, літаральна ў мінулую суботу разам з калегам, а таксама ваеннаслужачымі адной вайсковай часці і выхаванцамі ваенна-патрыятычнага клуба «Доблесць» узялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё», працавалі ў Бараўлянскім лясгасе Мінскага раёна. Падчас рэспубліканскага суботніка, які мае адбыцца, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў плануюць выехаць на памятнае месца ў Смалявіцкім раёне. У цэлым, удзел у суботніках і добраўпарадкаванні — гэта тое, чым я заўсёды была апантаная, працуючы старшынёй сельсавета. Калі да людзей знайсці падыход, калі з імі правільна пагаварыць, сустрэцца, арганізаваць іх, то яны з задавальненнем выходзяць на гэтыя акцыі.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота з архіва Таццяны ЛАЎРЫНОВІЧ.

ТРЫМАЦЬ НА КАНТРОЛІ

Старшыня Баранавіцкага гарадскога Савета Віктар КАЛАСОЎСКІ — аб суботніках, маладзёжным парламенце, выязных сесіях і пераемнасці работы

Прайшоў год работы дэпутатаў Баранавіцкага гарадскога Савета 29-га склікання. Утворана шэсць пастаянных камісій, у якіх працуюць дэпутаты. Пра некаторыя вынікі першага года работы, аб тым, як працягваюцца справы папярэднікаў і нараджаюцца новыя ініцыятывы, пра шэфства над маладзёжным парламентам сённяшняя гутарка са старшынёй Баранавіцкага гарадскога Савета Віктарам Каласоўскім.

— У пачатку нашай размовы прапаноўваю звярнуцца да галоўнага форуму прадстаўнічага органа мясцовай улады — сесіі. Ці мае намер цяперашні гарадскі Савет працягваць традыцыю папярэднікаў і праводзіць выязныя сесіі?

— Няма ніякай нагоды парушаць традыцыю папярэднікаў. Дэпутаты новага склікання ўжо ацанілі падобную форму работы. У сярэдзіне мінулага года на сесіі мы разгледзелі пытанне «Аб стане вытворчага траўматызму, выкананні заканадаўства па ахове працы ў арганізацыях горада». Месцам для правядзення мерапрыемства выбралі «Аўтобусны парк г. Баранавічы» зусім невыпадкова. Менавіта на гэтым прадпрыемстве больш за дзесяць гадоў не рэгістравалася ніводнага выпадку вытворчага траўматызму. Удзельнікі сесіі пазнаёміліся з вытворчай базай парка, пагаварылі з кіраўніцтвам і працаўнікамі. Было шмат пытанняў, на якія атрыманы падрабязныя адказы. Дэпутаты і ўдзельнікі сесіі прыйшлі да высновы, што вопыт прадпрыемства заслугоўвае вывучэння і распаўсюджвання. Абмеркаванне пытання парадку дня прайшло ў канструктыўным ключы, было прынята адпаведнае прашэнне.

Будзем і надалей праводзіць пасяджэнні Савета з выездам на месца. Сесія па пытаннях работы ўстаноў аховы здароўя з наведваннем шэрагу аб'ектаў пройдзе ў трэцім квартале. Профільная камісія прыступіла да яе падрыхтоўкі.

Калі размова зайшла пра выязныя сесіі, думаю, варта адзначыць пераемнасць нашай работы. Мы працягваем і даводзім да лагічнага завяршэння тое, што пачалі папярэднікі. Напрыклад, Савет 28-га склікання ў канцы 2023 года праводзіў выязную сесію з парадкам дня «Аб эфектыўнасці выкарыстання і прыцягнення ў гаспадарчы зварот аб'ектаў нерухомасці і зямельных участкаў суб'ектамі гаспадарання горада Баранавічы для развіцця прадпрымальніцкай дзейнасці». На пасяджэнні было прынята рашэнне, накіраванае на актывізацыю дзейнасці ў дадзеным кірунку, на прыцягненне ў гаспадарчы абарот дзяржаўнай маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

Некаторыя з пунктаў рашэння патрабавалі працяглай работы. Зразумела, што Савет, тэрмін паўнамоцтваў якога скончыўся ў лютым 2024 года, не мог трымаць на кантролі выкананне рашэння сесіі. Гэту работу ўзялі на сябе мы.

Вось і нядаўна разам з начальнікам упраўлення эканомікі гарвыканкама Алай Курыльчык зверылі пазіцыі, прайшліся па ўсіх асноўных пунктах рашэння і канстатавалі, што зроблена сапраўды многае. Некаторыя аб'екты знайшлі новых гаспадароў. На некаторых вядуцца работы па рэканструкцыі і рамонце. Цяжэй даводзіцца з тымі прадпрымальнікамі, якія набылі аб'ект, а ўмоў па яго прыцягненні ў гаспадарчы зварот не выконваюць.

З імі працуе спецыяльна створаная камісія гарвыканкама. Забяспечана вяртанне цэлага шэрагу аб'ектаў ва ўласнасць горада. Выкананне рашэнняў сесіі працягваем трымаць на кантролі.

— Нават калі звярнуцца да Баранавіцкага тэлеграм-канала, то ў ліку традыцый гарадскога Савета нярэдка называюць самыя розныя працоўныя акцыі, дзе прыклад паказваюць народныя выбраннікі. Якія працоўныя дэсанты за год работы можна назваць знакавымі?

— Агульныя працоўныя акцыі на карысць нашага горада набіраюць усё больш прыхільнікаў. Пры магчымасці да нас далучаюцца дэпутаты парламента і абласнога Савета, нярэдка працуем разам з прадстаўнікамі грамадскіх арганізацый, супрацоўнікамі гарадской выканаўчай улады. Напрыклад, летась увесь дэпутацкі корпус дружна папрацаваў на добраўпарадкаванні Свяцілаўскага возера ў паўночным мікрараёне горада. Мы ўпрыгожвалі прыбярэжную зону: абразалі галіны, прыбіралі смецце, нават правялі дэмантаж старой бетоннай плітак.

Летась падчас рэспубліканскага суботніка разам з членамі ваенна-патрыятычнага клуба адной з вайсковых часцей наводзілі парадак на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан, а таксама прыбіралі дарожкі могілак і тэрыторыю за агароджай. Восенню працавалі ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «Лясная вясёлка». І ўсе ўдзельнікі суботнікаў адзначалі, што калектыўная праца збліжае, спрыяе адчуванню клопату пра родную мясціну, пакідае найлепшыя ўражанні, дорыць станоўчыя эмоцыі. Таму пры кожнай магчымасці запрашаем юных калег з маладзёжнага парламента далучацца да нашых працоўных акцый.

— Дарэчы, пра маладзёжны парламент: наколькі мне вядома, большую частку яго складаюць маладыя людзі, якія працуюць на вытворчасці, ва ўстановах і арганізацыях горада. Якім чынам старэйшыя таварышы накіроўваюць іх работу?

— У склад новага маладзёжнага парламента пры гарадскім Савеце дэпутатаў увайшлі 29 чалавек з ліку працоўнай моладзі і восем студэнтаў. Маладыя людзі ўдзельнічаюць у пасяджэннях сесій, запрашаем на пасяджэнні прэзідыумаў, на асабістыя прыёмы грамадзян дэпутатамі ў акругах. Такім чынам юнакі і дзяўчаты набываюць уяўленне пра работу прадстаўнічага органа ўлады, атрымліваюць вопыт. Член маладзёжнага парламента папярэдняга склікання Аляксандр Альшэўскі падчас адзінага дня галасавання летась выбраны дэпутатам гарадскога Савета.

Можна згадаць ініцыятыву папярэдняга Маладзёжнага парламента «Найлепшы дворык», якая рэалізоўвалася ў горадзе з 2022 года. Маладыя людзі збіралі заяўкі ад жыльцоў шматкватэрнай забудовы, затым выязджалі на месца, ствараліэскізы, знаходзілі энтузіястаў з ліку нераўнадушных грамадзян і разам з імі рэалізаваць канцэпцыю ў жыцці. Такім чынам быў палепшаны шэраг дваровых тэрыторый. Спадзяюся, што цяперашні склад парламента таксама вызначыцца сваімі добрымі справамі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва гарадскога Савета.

Наименование банка:

ОАО «НКФО «ЕРИП»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	31.03.2025	01.01.2025
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	-	-
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	4 485	3 350
5	Средства в банках	1104	77 380	80 311
6	Ценные бумаги	1105	7 006	-
7	Кредиты клиентам	1106	-	-
8	Производные финансовые активы	1107	-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	864	864
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	11 764	7 943
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	-
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	-	-
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	-
14	Прочие активы	1113	4 902	5 502
15	ИТОГО активы	11	106 401	97 970
16	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
17	Средства Национального банка	1201	-	-
18	Средства банков	1202	-	-
19	Средства клиентов	1203	4 365	3 053
20	Ценные бумаги банка	1204	-	-
21	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	8 763	3 006
24	ВСЕГО обязательства	120	13 128	6 059
25	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
26	Уставный фонд	1211	57 945	57 945
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	4 507	3 356
29	Фонды переоценки статей баланса	1214	-	-
30	Накопленная прибыль	1215	30 821	30 610
31	ВСЕГО собственный капитал	121	93 273	91 911
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	106 401	97 970

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
31 марта 2025 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	31.03.2025	31.03.2024
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	3 061	1 593
2	Процентные расходы	2012	154	-
3	Чистые процентные доходы	201	2 907	1 593
4	Комиссионные доходы	2021	12 323	10 379
5	Комиссионные расходы	2022	3	2
6	Чистые комиссионные доходы	202	12 320	10 377
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	-	-
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	-	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	(15)	33
12	Прочие доходы	208	895	701
13	Операционные расходы	209	7 240	5 398
14	Прочие расходы	210	90	92
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	8 807	7 148
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	2 573	1 932
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	6 234	5 216

Председатель Правления В.А. Драгун

Главный бухгалтер С.Н. Кандидатова

Дата подписания: 02 апреля 2025 г.

УНП 807000268

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Гродненский стеклозавод»

Аукцион состоится 14.05.2025 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	Лот № 1 – питатель стекломассы, DS-P4-1 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4608. Лот № 2 – вентилятор, VV800-4/12/B1/L1 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4642. Лот № 3 – мешалка стекломассы, МС 795 в количестве 1 шт., инвентарный номер 5077. Лот № 4 – стеклоформующая машина (4-секционная), AL-114-2-2 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4609. Лот № 5 – переставитель стеклоизделий (прямой), SHEPPEE SI-1830-R1 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4611. Лот № 6 – толкатель тары с поперечным конвейером, ЗО220/180 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4675. Лот № 7 – вентилятор, LWN-Tornado TES16-450S-K-110-2-50 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4614. Лот № 8 – гранулятор стекломассы, GS-40 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4616. Лот № 9 – вентилятор, VV800-4/12/B1/L1 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4643. Лот № 10 – вентилятор, LWN-Tornado TES16-450S-K-110-2-50 в количестве 1 шт., инвентарный номер 4615
Условия проведения аукциона	1. 100 % предоплата в течение 20 рабочих дней после заключения договора купли-продажи. 2. Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат продавца по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта
Начальная цена продажи	Лот № 1: 367 200 руб. (триста шестьдесят семь тысяч двести рублей) с учетом НДС. Лот № 2: 5 640 руб. (пять тысяч шестьсот сорок рублей) с учетом НДС. Лот № 3: 6 840 руб. (шесть тысяч восемьсот сорок рублей) с учетом НДС. Лот № 4: 1 004 400 руб. (один миллион четыре тысячи четыреста рублей) с учетом НДС. Лот № 5: 4 080 руб. (четыре тысячи восемьдесят рублей) с учетом НДС. Лот № 6: 48 360 руб. (сорок восемь тысяч триста шестьдесят рублей) с учетом НДС. Лот № 7: 27 120 руб. (двадцать семь тысяч сто двадцать рублей) с учетом НДС. Лот № 8: 51 240 руб. (пятьдесят одна тысяча двести сорок рублей) с учетом НДС. Лот № 9: 5 640 руб. (пять тысяч шестьсот сорок рублей) с учетом НДС. Лот № 10: 27 120 руб. (двадцать семь тысяч сто двадцать рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	Лот № 1: 36 720 руб. (тридцать шесть тысяч семьсот двадцать рублей). Лот № 2: 564 руб. (пятьсот шестьдесят четыре рубля). Лот № 3: 684 руб. (шестьсот восемьдесят четыре рубля). Лот № 4: 100 440 руб. (сто тысяч четыреста сорок рублей). Лот № 5: 408 р. (четыреста восемь рублей). Лот № 6: 4 836 руб. (четыре тысячи восемьсот тридцать шесть рублей). Лот № 7: 2 712 руб. (две тысячи семьсот двенадцать рублей). Лот № 8: 5 124 руб. (пять тысяч сто двадцать четыре рубля). Лот № 9: 564 руб. (пятьсот шестьдесят четыре рубля). Лот № 10: 2 712 руб. (две тысячи семьсот двенадцать рублей)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 08.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 08.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 12.05.2025 г. до 15.00**

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержится в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, местонахождение: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321, тел. 8 017 516 80 64) по поручению **государственного учреждения «Центр по обеспечению деятельности бюджетных организаций Копыльского района»** (223927, Минская область, г. Копыль, ул. Максима Горького, 31/3), проводит открытый аукцион

по продаже автомобиля легкового универсала LADA PRIORA ВАЗ-21713,

2011 г. в., регистрационный знак 6705 ОК-5, кузов (VIN) ХТА217130С0074426, цвет – тёмно-серо-зеленый, инвентарный номер 01510002, находящегося по адресу: Минская область, Копыльский район, аг. Слобода-Кучинка, ул. Советская, 38а.

Начальная цена (без НДС) – **5 200,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **520,00** бел. руб.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608 и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.
Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 01.02.2025.
Электронные торги состоятся **24.04.2025** в **10.00.**
Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.04.2025** до **17.00.**

Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 136-31-11.
Тел. для осмотра транспорта +375 29 566 37 46, время осмотра с 09.00 до 16.00 понедельник – пятница.

УНП 600093323

ЗЯМЕЛЬНАЯ АМНІСТЫЯ. ПРЫСТАЛІЧНЫ ВАРЫЯНТ

Амаль палова самавольна занятых участкаў — у Мінскай вобласці

Узаконьванне самавольных пабудоў і самавольна занятых зямельных участкаў — менавіта гэта тэма стала галоўнай на чарговым пасяджэнні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў. Гэта сапраўды сур'ёзная тэма, бо за ёй стаіць велізарная работа, пра якую кажуць лічбы. Так, пры правядзенні інвентарызацыі ў 2022 і 2023 гадах па ўсёй краіне выяўлена звыш 284 тысяч фактаў самавольнага заняцця зямель. Прычым большая частка іх — у Мінскай вобласці.

Як падкрэсліла **член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ,** мясцовыя органы ўлады праводзяць вялікую работу для таго, каб юрыдычна афарміць зямельныя ўчасткі, самавольна занятыя грамадзянамі: «У 2022 годзе ўступіла ў сілу новае заканадаўства, абноўлены Кодэкс аб зямлі. Пасля гэтага была праведзена інвентарызацыя зямельных участкаў, а таксама параўнанне (наколькі фактычныя межы, займаныя грамадзянамі, адпавядаюць юрыдычным, па дакументах), — патлумачыла Наталля Якубіцкая. — І я хачу сказаць, што сёння наша работа і дадзеная сесія нацэлены на тое, каб паглядзець, ці ўсе вычарпальныя меры прымаем для таго, каб аказаць садзейнічанне нашым людзям. У мінулым годзе Мінскім абласным Саветам дэпутатаў праводзіўся маштабны семінар, на якім старшыняў сельскіх Саветаў нацэлілі на ўзаемадзеянне з грамадзянамі па легалізацыі і афармленні зямельных участкаў».

Кіраўнік дэпутацкага корпуса Міншчыны адзначыла, што ў ходзе інвентарызацыі такіх самавольна занятых участкаў па Мінскай вобласці іх было выяўлена каля 120 тысяч: «Мы бачым, якая вялікая работа наперадзе, але заканадаўства дазваляе нам у спакойным тэмпе займацца гэтай работай. Зямельная амністыя прадугледжвае афармленне такіх участкаў да 1 студзеня 2028 года. Але мне хацелася б звярнуцца да нашых грамадзян. Усе павінны разумець, што такой унікальнай магчымасцю абавязкова трэба скарыстацца. І гэта трэба зрабіць, каб скараціць колькасць зваротаў, спрэчак з суседзямі. Калі межы зямельных участкаў будуць узаконены, такія пытанні проста перастануць узнікаць».

Паводле яе слоў, людзі павінны таксама разумець, што гэта іх гарантыі, гэта магчымасць перадачы ў спадчыну сваёй маёмасці і сваёй зямлі: «А яшчэ ў ходзе дадзенай работы мы таксама разумеем, якія магчыма ўнесці змены ў заканадаўства. І мы абавязкова гэтым скарыстаемся. Мы абавязкова будзем працаваць, збіраць пытанні, якія сёння, можа, яшчэ не дапрацаваны, і ўносіць змены ў Кодэкс аб зямлі», — падагульніла Наталля Якубіцкая.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота тэлеграм-канала «Мінская вобласць і пра галоўнае».

БУДЗЬЦЕ Ў КУРСЕ

КАРТКАЙ — У ТРАЛЕЙБУСЕ, ПА QR-КОДЗЕ — У МЕТРО

А ў Мінску тым часам чакаюцца новаўвядзенні ў аплаце грамадскага транспарту

Як расказаў дырэктар ДУ «Сталічны транспарт і сувязь» Юрый СУПРАНОВІЧ, да канца 2025 года плануецца ўкараненне сістэмы аплаты праезду ў наземным транспарце з дапамогай банкаўскіх картак: «Мы спадзяёмся рэалізаваць у бягучым годзе магчымасць аплаты праезду банкаўскай карткай на наземным транспарце. Гэта звычайная зарплатная картка, якой чалавек зможа карыстацца без дадаткаў», — растлумачыў спікер.

Што датычыцца метрапалітэна, там стане больш турнікетаў для аплаты праезду пры дапамозе QR-кодаў. Ужо заключаны дагавор на мадэрнізацыю 30 аўтаматызаваных прылад. Усе работы правядуць у 2025 годзе.

«Акрамя таго, у сталіцы з 10 красавіка ўвядуць новы тып праязнога — турыстычны, — расказаў Юрый Супрановіч. — Яго можна будзе набыць на адзін або тры дні. Праязным можна будзе карыстацца як у наземным грамадскім транспарце, так і ў метро».

Яна ВАЛАСАЧ.

Мясцовае самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 12 318. Нумар падпісаны ў 19.30 8 красавіка 2025 года.

Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!
Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі
ЗВЯЗДА
ОРГАН ЦК КПБ(б) БЕЛАРУСІ, СОВНАРКОМА І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР
ХРОНІКА Вялікай ПЕРАМОГІ
65 (7391)
АЎТОРАК
10
красавіка 1945 г.
Цана: 20 кап.
Войскі 3-га Беларускага фронта завяршылі разгром Кёнігсбергскай групы нямецкіх войск і штурмам авалодалі крэпасцю і сталіцай Усходняй Прусіі—Кёнігсбергам. За дзень баёў войскі фронта узялі ў палон больш 27.000 нямецкіх салдат і афіцэраў. Захоплены багаты трафей. Слава нашай гераічнай Чырвонай Арміі.

• На фронце

Войскі 3-га Беларускага фронту пасля ўпартых вулічных баёў завяршылі разгром Кёнігсбергскай групы нямецкіх войск і 9 красавіка штурмам авалодалі крэпасцю і галоўным горадам Усходняй Прусіі — Кёнігсбергам — стратэгічна важным вузлом абароны немцаў на Балтыйскім моры.

Паводле звестак Савецкага інфармбюро, за дзень баёў да 20 гадзін франтавікі ўзялі ў палон звыш 27 тысяч нямецкіх салдат і афіцэраў, а таксама захапілі вялікую колькасць узбраення і рознай ваеннай маёмасці. **«Рэшткі Кёнігсбергскага гарнізона на чале з камендантам крэпасці — генералам ад інфантэрыі Ляш і яго штабам сёння, у 21 гадзіну 30 мінут, спынілі супраціўленне і склалі зброю», — паведамляла наша газета.**

На паўночным усходзе і на поўначы ад Браціславы войскі 2-га Украінскага фронту, прадаўжаючы наступленне, занялі на тэрыторыі Чэхаславакіі больш за 40 населеных пунктаў, у тым ліку буйныя Саблагоў, Бецкоў, Стара Тура, Сабацішце, Лапашоў, Радзімоў. На захадзе ад Браціславы войскі фронту наступалі па паўночным беразе Дуная на Вену і занялі Цверндорф, Обер Вайдэн, Шэнфельд, Ласзее, Харынгзее, Фуксенбігль, Штраудорф, Орт, Мансдорф, Шэнау.

Войскі 3-га Украінскага фронту вялі паспяховыя баі на вуліцах Вены. **«Нанесячы ўдары з паўднёвага ўсходу, поўдня, захаду і паўночнага захаду, савецкія часці, пераадольваючы супраціўленне, ачышчаюць ад немцаў кварталы за кварталам. Нашы войскі, якія прасоўваюцца ўздоўж Дунайскага канала, авалодалі механічным заводам, газавым заводам, гарадской радыёстанцыяй, казармамі і вядуць баі ў раёне манетнага двара. Гвардзейскія пяхотныя і танкавыя злучэнні, якія наступаюць з захаду, прарваліся ў цэнтральныя раёны горада і авалодалі цэнтрам аўстрыйскай сталіцы», — пісала «Звязда».** За дзень баёў было знішчана некалькі тысяч салдат і афіцэраў праціўніка.

У баях за 8 красавіка франтавікі ўзялі ў палон звыш 1700 нямецкіх салдат і афіцэраў і захапілі наступныя трафеі: самалётаў — 25, танкаў і самаходных гармат — 191, бронетранспарцёраў — 30, палявых гармат — 245, мінамётаў — 50, кулямётаў — 106, паравозаў — 30, вагонаў — 1665, складоў з ваеннай маёмасцю — 42.

• У тыле

«Веснавое сонца шчодра палівала сваімі праменнямі неабсяжны прастор калгаснай зямлі. Працаўнікі палёў пакідалі вёску — жыццё пераходзіла туды, дзе пачыналася барацьба за ўраджай», — так вобразна пачынала «Звязда» чарговы рэпартаж пра вясновыя клопаты сялян.

У калгасе «Пяскі» Церахоўскага раёна Гомельскай вобласці было надзвычай ажыўлена. Старшыня сельскагаспадарчай арцелі Іван Сяргеевіч Бібікаў ужо каторы раз даваў дзелавыя парады брыгадзірам: «Глядзіце ж, каб усё было ў парадку, — гаварыў ён. — Самі ведаеце — першы дзень».

На полі доўгай стужкай праходзіла першая, роўная, нібы струна, баразна. Адзін за другім аратыя браліся за работу, уздымаючы тоўстыя пласты глебы, што адпачыла за зіму. Так калгаснікі сельгасарцелі «Пяскі» распачынялі веснавую сяўбу.

У гэты дзень сеялі, пэўна, ва ўсёй Церахоўшчыне. «На палі выйшлі і падлеткі, і з бялеючай сівізной старыя. І кожны


КАЛГАСНАЯ ВЯСНА

імкнуўся зрабіць лепш, зрабіць больш. Вось араты з калгаса «Комсамолец» Нікалай Карэба. За першы дзень ён значна перавыканаў заданне і замест 0,5 гектара па норме ўзараў 0,75 гектара», — паведамляла наша газета.

Веснавы дзень год корміць — гэту прыказку людзі добра разумелі і нават на сабе адчувалі. Кожнае звяно і брыгада імкнуліся не прапусціць ранніх тэрмінаў сяўбы і паспець пасеяць у найлепшыя дні, калі глеба была напоўнена вільгаццю.

Калгаснікі «Чырвонага расцвету» добра папрацавалі яшчэ ў перадпасяўныя дні — не прымусілі чакаць і вынікі: «Сёння калгас пасеяў звыш 30 працэнтаў усіх яравых. Да міжнароднага свята — Першага мая, — гаварыў старшыня сельгасарцелі таварыш Ларчык, — мы разлічваем поўнасцю завяршыць веснавую сяўбу».

***

Шматлюдным стала арцельнае поле. Калгасная вёска выйшла на працу, на барацьбу за высокі ўраджай. **«Па прасёлачнай дарозе адзін за другім ідуць трактары. Гэта брыгадзір перадавой трактарнай брыгады Церахоўскай МТС таварыш Сотнікаў вядзе свае машыны на палі калгасаў Гардуноўскага сельсавета».** Пакідаючы сядзібу МТС, брыгада дала слова — утрымаць першынство ў сацыялістычным спаборніцтве трактарных брыгад, узараць за вясну 2900 гектараў: «І ў гэтым годзе мы будзем пераможцамі», — быў цвёрда ўпэўнены брыгадзір.

Вядучая рубрыкі Яна ВАЛАСАЧ.

Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Предметы аукциона	Начальная цена, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15215 (наименование: жилой дом; назначение: здание блокированного жилого дома) площадью 73,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Большие Сеховичи, ул. Центральная, 22, на земельном участке с кадастровым номером 122581001601000106 площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: пристройка, сарай, сарай, сарай, уборная	16 092,48	1 609,25
Лот № 2: капитальное строение с инвентарным номером 141/С-15214 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома) площадью 51,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, аг. Матеевичи, ул. Новая, 27, на земельном участке с кадастровым номером 122581005601000177 площадью 0,2500 га, составные части и принадлежности: пристройка, погреб, сарай, сарай, колодец	10 812,00	1 081,20
Лот № 3: капитальное строение с инвентарным номером 101/С-3312 (наименование: жилой дом; назначение: здание одноквартирного жилого дома) площадью 36,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Жабинковский р-н, Кривлянский с/с, д. Большие Сеховичи, ул. Центральная, 33, на земельном участке с кадастровым номером 122581001601000054 площадью 0,2010 га, составные части и принадлежности: холодная пристройка, четыре сарая, уборная, колодец	8 067,83	806,78

Продавец: ОАО «Матеевичи», 225101, Брестская обл., Жабинковский р-н, аг. Кривляны, ул. Ленина, 5-1, тел. 80164131445. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. Р/с для перечисления задатка: BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона

Аукцион состоится 24 апреля 2025 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-02**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 09.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 23 апреля 2025 г. до 17.00

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона/ оператор	ООО «ИПМ-Консалт оценка». 220004, г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by
Продавец	ОАО «Витязь». 210605, г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13а. УНП 300031652
Предмет электронных торгов	
Лот № 1	
Нежилое помещение (нежилое помещение) с кадастровым номером 78:34:0004221:1419, общ. пл. 175,4 кв. м, по адресу: ***Российская Федерация, г. Санкт-Петербург, ул. Репищева, дом 7, литер А, пом. 19-Н.*** Обременение: договор аренды	
Начальная цена лота № 1, без НДС – 903 944,51 бел. рублей	
Лот № 2	
Нежилое помещение (нежилое помещение) с кадастровым номером 60:27:0020304:628, общ. пл. 124,4 кв. м, по адресу: ***Российская Федерация, Псковская обл., г. Псков, ул. Яна Фабрициуса, д. 25, пом. 1003.*** Обременение: договор аренды	
Начальная цена лота № 2, без НДС – 423 036,83 бел. рублей	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB3012 00483500802260000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638	
Срок подписания договора купли-продажи: 20 (двадцати) календарных дней со дня завершения электронных торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов: если между продавцом и покупателем (победитель либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты объекта, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – **4 %**, по лоту № 2 – **6 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов	
Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете Звязда от 07.03.2025 г. (лот № 1), от 21.03.2025 г. (лот № 2)	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: 25.04.2025 г. с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Дата и время окончания приема заявок: заявки на участие в электронных торгах принимаются по **24.04.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные данные	**Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

БУДЗЕМ ВЫВУЧАЦЬ

НАРОДНАЯ ЭКАНОМІКА

Вы пытаецеся ў мяне: навошта новы прэм'ер-міністр Аляксандр Турчын ініцыіраваў сацыялагічнае даследаванне (праходзіць з 4 да 21 красавіка, яго вынікі будуць улічвацца пры распрацоўцы і зацвярджэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. – «Зв.»)? Навошта яно для распрацоўкі Праграмы? Ды яшчэ праводзіцца шырокая інтэрактыўная кампанія па зборы персанальных пажаданняў і прапаноў грамадзян? У нас жа ёсць шырокі спектр аналітычных, даследчых арганізацый, экспертаў і вучоных, якія могуць з веданнем справы сфарміраваць усе ідэі, алічбаваць іх, вызначыць вектары руху дзяржавы. Чым могуць дапамагчы абывацелі? Бо далёка не ўсе (дакладней — наогул адзінкі) нешта рэальна разумеюць у макраэканоміцы. Ды і ўсяго доступу да інфармацыі для аналізу ў іх няма.

Адказваю: вельмі правільны і своечасовы ход прыдумаў Аляксандр Генрыхавіч. Эканоміка — гэта не абстракцыя, а рукатворная з'ява. І яна патрэбна не для лічбаў і графікаў, якімі іншы раз хвацка жангліруюць прафесіяналы, а для задавальнення матэрыяльных і духоўных патрэб людзей. І эканоміку ў канчатковым выніку робяць не эксперты, прагназісты, аналітыкі і нават не топ-менеджары, а грамадзяне. І вельмі справядліва ў іх даведацца: якой яны жадаюць бачыць краіну ў наступнай пяцігодцы?

Сучасныя лічбавыя тэхналогіі — невычэрпная крыніца натхнення для сацыёлагаў. Развіты камунікацыі спрашчаюць правядзенне апытанняў, ёсць сацыяльныя сеткі, мноства інтэрактыўных інструментаў, каб спазнаць грамадскія настроі. Напэўна, мы пакуль недастаткова выкарыстоўвалі гэтыя магчымасці для планавання эканомікі. І цяпер далучаемся да трэнду апошняй хвалі. А тэндэнцыі такія, што эканоміка ўсё больш паглыбляецца ў міждысцыплінарныя калабарацыі з псіхалогіяй, фізіялогіяй, культурай... За якія даследаванні атрымліваюць сёння нобелеўскія прэміі? Адкажу: якія прысвечаны вывучэнню алгарытмаў прыняцця рашэнняў так званымі эканамічнымі агентамі. Гэта не толькі карпарацыі, буйныя і малыя фірмы, але і хатнія гаспадаркі і кожны паасобку ўзяты чалавек. Нават сусветныя аналітычныя агенцтвы ўжо не ў поўнай ступені спадзяюцца на свае складаныя матэматычныя мадэлі, а ўсё часцей прагназуюць тыя ці іншыя з'явы праз апытанні дзясяткаў і нават соцень тысяч грамадзян па ўсім свеце. Ад іх залежыць практычна ўсё.

ФРС можа павышаць уліковую стаўку або зніжаць. Золата, нафта і тытан могуць даражэць або таннець на біржах. Банкіры, інвестыцыйныя фонды і высокатэхналагічныя карпарацыі могуць распрацоўваць і рэалізоўваць свае мудрагелістыя і складаныя стратэгіі. Але кошт таго ж долара залежыць не ад іх. І нават не ад Дональда Трампа, нягледзячы на яго баявы і валявы характар. Цэны амерыканскай валюты вызначаюць яе трымальнікі, якія раскіданы па ўсім свеце. Прычым не толькі мільярдэры і ўладныя людзі, але ў немалой ступені і простыя грамадзяне. Калі заўтра ўсе, хто захоўваў свае зберажэнні ў «зялёнай» грашовай адзінцы, раптам у ёй расчаруюцца або перастануць верыць у долар, кінуцца ад яго пазбаўляцца, то фінансавы крызіс у канцы 2000-х для амерыканскіх кіраўнікоў здасца дробнай непрыемнасцю. Людзі, як той казаў, галасуюць. А фінансавым тузам на Уол-стрыт даводзіцца падпарадкоўвацца. І падладжвацца пад факт, які адбыўся.

Які галоўны паказчык інфляцыі? Чаканні павышэння ці паніжэння цэн. Людзі кіруюцца сваімі ўяўленнямі. Аб асабістай інфляцыі напісана шмат і падрабязна. У кожнага яна свая, у залежнасці ад індывідуальнасці спажывання. І прымаем мы свае рашэнні зыходзячы з гэтай індывідуальнасці. Макраэканамічныя паказчыкі і меркаванні экспертаў — другасныя. Можам да іх прыслухацца, а можам — і праігнараваць. Але, зыходзячы са сваіх чаканняў, мы альбо імкнёмся прыкупіць нейкія тавары ў запас, альбо, наадварот, займаем чакальную пазіцыю: імкнёмся сабраць грошай да лепшых часоў з нашага пункта гледжання. Як фарміруюцца ўяўленні ў нашай галаве? Ды хто б мог адказаць на гэта пытанне?! Калі каму-небудзь удасца, атрымае Нобэлеўскую прэмію. Магчыма, не адну. І зможа зарабіць трыльёны долараў. Ілан Маск, Бафет і Безас будуць такому адкрывальніку партфель насіць.

Як мы мыслім — пакуль загадка навукі. Але вынік нашых думак можа зафіксаваць сацыялогія. Адпаведна, хаця б у першым набліжэнні выказаць здагадку пра паводзіны людзей. Паводзінская эканоміка — велізарнае поле для сучасных даследаванняў. І наш урад да планавання і прагназавання падыходзіць па навуцы. І я яго поўнасцю падтрымліваю.

Шмат, вельмі шмат даводзіцца чытаць разумных навукоўцаў і кіраўнікоў аб тым, якіх нам трэба дасягнуць паказчыкаў ВУП, росту інвестыцый, дынамікі прамысловай вытворчасці, заработнай платы... Згодзен я з імі ці не — не так важна. Галоўнае: а беларусам патрэбны гэтыя дасягненні? І якая цана гэтых дасягненняў? Цана ёсць ува ўсяго. У тым ліку і ў эканамічнага росту. Калі вярнуць прыгоннае права, мяркую, росту валавога прадукту разы ў два (а то і больш) можна дамагчыся гады за два-тры. Шмат работы, мала спажывання (лапцей і поліўкі дастаткова), працоўны дзень — гадзін 12, усе сродкі — у інвестыцыі і тэхнічнае развіццё... Рывок забяспечаны. Але, баюся, многія (ці нават усе) з такім падыходам не пагодзяцца.

Утрырую, не спрачаюся. Але так ужо ўладкавана наша няпростае жыццё. Ці ўсе гатовы да высокатэхналагічнай эканомікі? Гэта калі робаты носяцца па цэхах, а людзі іх раманцуюць, праграмуюць, распрацоўваюць новыя мадэлі. Ці гатовыя стаць інжынерамі? Змяніць прафесію: сесці за парту, пакутліва ўспамінаць матэматыку, законы фізікі, хіміі і іншыя прамудрасці дакладных і прыродазнаўчых навук? Лічбавай эканоміцы патрэбны і лічбавыя людзі, якія не шукаюць квадратны корань з лапатай на агародзе, а мысляць лагарыфмамі, інтэграламі і складанымі формуламі. Ці ўсе хочуць паглыбіцца ў гэту абстракцыю? Нават калі ў канцы пакут чакае высокі заробак? Ведаю нямала знаёмых, якія пагодзяцца на сціплы заробак — абы не ламаць галаву. Ды і ў цэлым да прарыўных працоўных подзвігаў яны не гатовы. Не таму, што гультаі ці маргіналы. І скнарамі яны таксама не з'яўляюцца. Але, не адмаўляючыся ад матэрыяльнага, яны шануюць і свой вольны час. І яны сапраўды шчаслівыя, валодаючы адносна невысокім дастаткам. Ад дадатку да заробку не адмовяцца. Але на прапанову больш выгаднай, але складанай працы пагардліва паціснуць плячыма. Нямала фанатаў бурнай дзейнасці. Але ад яе чакаюць пэўнага выніку. Розныя ёсць светапогляды. І гэта катэгорыя не толькі псіхалагічная, але і эканамічная. Павагі заслугоўвае любая пазіцыя. І вельмі вялікая памылка — з вожыкаў рабіць зайчыкаў ці іншых звяркоў. Рабіць з флегматыка — харызматыка, а з пасіянарыя — банальнага выканаўцу можна, але занадта ўжо затратна. Інструменты сацыяльнай інжынерыі занадта нераацэнены. Можна ўплываць на светапогляд грамадства. Але магчымасці вельмі абмежаваны. Разумны кіраўнік будзе не ламаць, а максімальна эфектыўна выкарыстоўваць той чалавечы капітал, які ёсць. Вывучыць зыходныя пазіцыі і эканамічныя настроі ў грамадстве і сабярэ ўрад. Каб наступная пяцігодка набыла максімальна рысы народнай эканомікі. Будзем гэта пытанне вывучаць і надалей.

Штучны інтэлект.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ • ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2
Продавец	ОАО «Минский домостроительный комбинат», 220015 г. Минск, ул. Пономаренко, 43
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

№ лота	Предмет электронных торгов	Начальная цена (без НДС), бел. руб.
1	**Квартира,** общ. пл. 105,3 кв. м, инв. № 500/D-7988236244, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-65	389 600,00
2	**Квартира,** общ. пл. 92,0 кв. м, инв. № 500/D-7988236245, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-66	340 400,00
3	**Квартира,** общ. пл. 91,9 кв. м, инв. № 500/D-7988236246, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-71	357 900,00
4	**Квартира,** общ. пл. 43,3 кв. м, инв. № 500/D-7988236247, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-73	175 600,00
5	**Квартира,** общ. пл. 81,1 кв. м, инв. № 500/D-7988236248, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-75	315 800,00
6	**Квартира,** общ. пл. 81,3 кв. м, инв. № 500/D-7988236249, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-82	316 600,00
7	**Квартира,** общ. пл. 91,9 кв. м, инв. № 500/D-7988236250, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-85	357 900,00
8	**Квартира,** общ. пл. 43,6 кв. м, инв. № 500/D-7988236251, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-87	176 800,00
9	**Квартира,** общ. пл. 81,1 кв. м, инв. № 500/D-7988236252, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-89	315 800,00
10	**Квартира,** общ. пл. 91,8 кв. м, инв. № 500/D-7988236253, по адресу: г. Минск, ул. Академика Купревича, 16-92	357 500,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены предмета аукциона по всем лотам

Задаток 1 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи:	**Срок оплаты предмета электронных торгов:**
5 (пять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов	**3 (три) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и установленное вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.05.2025 г. с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 08.05.2025 г. до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ООО «Химтэкинвест» (организатор торгов) извещает о проведении второго повторного открытого **аукциона** на повышение начальной цены со снижением цены первого аукциона на 15 % по реализации объекта недвижимости: **капитальное строение с инвентарным номером 100/С-76236.**

Назначение: **сооружение, специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства.**

Наименование: **автомобильная заправочная станция с комплексом сервисных услуг автодороги Брест – Минск – граница РФ (11-й км справа).**

Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121200000001000187 площадью 1,5531 га (Право аренды по 25.11.2104, доля 1/1) в г. Брест, ул. Калиновая, 115.
Собственник имущества – ООО «КД-Инвест» УНП 391298470, тел./факс (0214) 50-01-88.

Начальная цена – 1 861 500 рублей. Сумма задатка – 93 075 рублей. Шаг торгов – 93 075 рублей.
Цена без НДС (НДС сверху не начисляется п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).
Данный лот находится в обременении в ипотеке и аренде.
Начало подачи заявок – 10 апреля 2025 года, 09.00. Окончание подачи заявок – 21 апреля 2025 года 09.00.
Заявки на участие в торгах принимаются по адресу:
211443, Витебская обл., г. Новополоцк, ул. Молодежная, д. 11А, пом. 20.
Организатор торгов – ООО «Химтэкинвест» УНП: 191685984.
При необходимости ознакомиться с документами и предметом аукциона можно, направляя запрос на электронную почту producomob2016@mail.ru или по тел. 8-0339033614.

Начало торгов 23 апреля 2025 года в 9.00 по адресу: г. Новополоцк, ул. Молодежная, 11А, комн. 20.

Торги проводятся при наличии двух и более допущенных к торгам участников. Победителем торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот. К участию в торгах допускаются физические и юридические лица, подписавшие соглашение до начала торгов об ознакомлении с предметом торгов и копиями договоров аренды; зарегистрированные в журнале регистрации заявлений; предоставившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах, копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей; доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет руководитель); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Физическим лицам – предъявить паспорт, иной документ, подтверждающий личность.

Задаток перечисляется на р/с номер счета (IBAN): BY13SLAN30124208400000100000 в г. Минск, ЗАО БАНК ВТБ (БЕЛАРУСЬ), код банка (BIC): SLANBY22, УНП: 191685984, ООО «Химтэкинвест» до подачи заявки на участие в аукционе, назначение платежа: «Задаток за участие в торгах по капитальному строению с инвентарным номером (указать номер)».

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после дня проведения торгов (физическим лицам – на карт-счет, указанный при регистрации; юридическим лицам, ИП – на расчетный счет).

Участнику, выигравшему торги, задаток не возвращается и учитывается в счет оплаты предмета торгов по договору купли-продажи. Победитель торгов (либо единственный участник, давший согласие на приобретение лота), т. е. покупатель, подписывает протокол по результатам торгов в день его проведения, и в обязательном порядке возмещает затраты на организацию и проведение торгов в размере **309,96 бел. руб.** в течение 5 (пяти) календарных дней после проведения торгов, а также обязан заключить договор купли-продажи с собственником предмета торгов в течение 2 рабочих дней после проведения аукциона. Срок оплаты предмета торгов: в соответствии с заключенным договором.

В случае если к участию в торгах был допущен только один участник, он может приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов (т. е. начальная цена + 5 % + затраты на организацию и проведение торгов) путем подтверждения приобретения в день торгов.

Продавцом предоставляется отсрочка оплаты предмета аукциона 60 дней с момента переоформления имущества на покупателя.

В случае отказа или уклонения победителя торгов (или единственного участника, давшего согласие на приобретение лота) от подписания протокола и (или) договора купли-продажи, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов, результаты торгов аннулируются, внесенный им задаток возврату не подлежит, а включается в состав имущества собственника предмета торгов.

Организатор оставляет за собой право отменить аукцион без объяснения причин не менее чем за трое суток до начала его проведения. Ранее опубликованные объявления о предыдущих торгах 28 декабря 2024 года и 05 февраля 2025 года в этом же издании.

АЦАНІЦЬ МАГЧЫМАСЦІ І ПРАПАНАВАЦЬ ПЕРАВАГІ

КАШТОЎНАСЦІ МІНСКА І АБЛАСНЫХ ЦЭНТРАЎ

Як паведаміла **дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ,** у нашай краіне дзейнічае 618 гасцініц і аналагічных сродкаў размяшчэння, дзе адначасова могуць пражываць больш за 39 тысяч чалавек. Увогуле, дзелавы турызм найчасцей асацыруецца менавіта з гатэлямі, дзе маюцца залы для правядзення дзелавых мерапрыемстваў, якія адпавядаюць усім крытэрыям.

І калі ў Мінску дастаткова такіх пляцовак, то сітуацыю ў рэгіёнах спецыялісты Дэпартамента па турызме вывучаюць. Летась у рамках месяца дзелавога турызму яны наведвалі Магілёў, сёлета — Брэст, дзе ацанілі ўсе пляцоўкі, якія могуць прымаць такія мерапрыемствы рознага маштабу. Сярод пераваг абласных гарадоў — прамое авіязлучэнне з Масквой і Санкт-Пецярбургам.

Як адзначыла Ірына Варановіч, адкрыццё Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра не засталося незаўважаным расійскімі дзелавымі коламі, якія пабывалі на выстаўцы «Адпачынак-2025». Прадстаўнікі расійскага бізнесу праяўляюць цікавасць да правядзення тут розных мерапрыемстваў.

ВЫСТАВАЧНАЯ ЖАМЧУЖЫНА

У Мінскім міжнародным выставачным цэнтры плануецца праводзіць не толькі выстаўкі, але і буйныя кангрэсы. Асноўны запыт звязаны з гэтымі мерапрыемствамі, бо няпроста знайсці аналагічныя пляцоўкі, якія могуць прыняць у адной зале тысячу чалавек і больш, а потым развесці патокі слухачоў на некалькі канферэнц-залаў паралельна.

— Пачалі марафон з выстаўкі «Адпачынак-2025». Паказваем нашу пляцоўку напярэдадні адкрыцця і прадоўжым гэту работу. Упэўнены, што Мінскі міжнародны выставачны цэнтр стане пунктам прыцягнення як для грамадзян нашай краіны, мінчан, так і для дзелавых турыстаў, замежных дэлегацый, трамплінам для развіцця дзелавога турызму, — падкрэсліла **начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва і спецыяльных праектаў дзяржаўнага прадпрыемства «БелЭкспа» Любоў СМІРНОВА.**

Мінскі міжнародны выставачны цэнтр не мае аналагаў у Беларусі па магчымасцях трансфармацыі, інавацыйнасці і мабільнасці. У канцы снежня тут была прадстаўлена выстаўка дасягненняў суверэннай Беларусі «Мая Беларусь». За месяц яе наведалі больш за 400 тысяч чалавек. Наступны праект — маштабная выстаўка да 80-годдзя Перамогі, падрыхтоўка якой выходзіць на фінішную прамую. Ужо з 9 мая стартуюць мерапрыемствы, прысвечаныя гэтаму юбілею. Пляцоўка зажывае паўнацэнным жыццём: будзе прымаць гасцей і наведвальнікаў. У гэтым і ў наступным годзе тут пройдуць як нацыянальныя, так і міжнародныя выстаўкі. Адна з іх — выязная прамысловая выстаўка «ІНАПРАМ», якая адбудзецца восенню.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«АДПАЧЫНАК» У НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Міжнародную выстаўку-кірмаш турыстычных паслуг «Адпачынак-2025» таксама можна лічыць адной з падзей дзелавога турызму. Яе сёлета наведалі каля 8,5 тысячы гасцей — на тысячу больш, чым летась.

— Яшчэ да пандэміі часта гучалі развагі аб тым, ці не ўжыў сябе фармат выставак, наколькі эфектыўны ўдзел у іх для турыстычных кампаній. На фоне ўсіх трансфармацыйных падзей выстаўкі таксама не маглі не змяніцца, — звярнуў увагу **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ.** — Сістэма электроннай рэгістрацыі дае магчымасць дастаткова дакладна адсачыць лічбы, і мы адзначаем рост папулярнасці. У многім ён абумоўлены тым, што зменены фармат. Былі прадстаўлены ўсе вобласці і раёны нашай краіны на вялікіх абласных стэндах. Зала дзеліцца на дзве часткі — нацыянальную і міжнародную, — адзначыў Дзмітрый Марозаў.

Для наведвальнікаў і турыстаў, якія жадаюць вызначыцца з планамі на адпачынак, выстаўка — зручны фармат для таго, каб пазнаёміцца з пастаўшчыкамі турыстычных паслуг з розных рэгіёнаў краіны. Прычым на стэндах прадстаўлены суб'екты турыстычнай індустрыі —музеі, паркі адпачынку, гасцінічныя комплексы, аграсядзібы.

Алена КРАВЕЦ.

Тым часам

Звыш 920 тысяч чалавек удзельнічалі ў мерапрыемствах месяца прамысловага турызму

У сакавіку ў Беларусі праводзіліся дні адкрытых дзвярэй і вытворчыя экскурсіі, дзе наведвальнікі знаёміліся з гісторыяй, дасягненнямі, сучаснымі тэхналогіямі і планамі развіцця прадпрыемстваў. «Каля 2850 такіх мерапрыемстваў адбылося па ўсёй краіне, у якіх удзельнічалі больш за 920 тысяч чалавек. Летась у месяц прамысловага турызму праведзена каля 440 мерапрыемстваў, колькасць удзельнікаў склала амаль 54 тысячы чалавек», — паведамілі БелТА ў Нацыянальным агенцтве па турызме.

Таксама быў арганізаваны выязны семінар у Салігорскі раён для прадстаўнікоў турыстычнага бізнесу. Турыстычныя інфармацыйныя цэнтры ў розных рэгіёнах падрыхтавалі разнастайныя актыўнасці для ўсіх жадаючых, уключаючы фотаконкурс «Я там быў!», анлайн-віктарыны і тэматычныя экскурсіі для школьнікаў. Прадпрыемствы харчовай і машынабудаўнічай прамысловасці прадстаўлялі свой патэнцыял на выстаўцы «Адпачынак-2025».

У Беларусі выдадзены тэматычная брашура і відэаролік, метадычныя рэкамендацыі па правядзенні вытворчых экскурсій. Арганізаваны наведванне прамысловых аб'ектаў у час азнаямленчых турaў для замежных СМІ, а таксама выязныя семінары для тураператараў па прадпрыемствы, зацікаўленыя ў развіцці прамысловага турызму. Праведзена маркетынгавае даследаванне «Прамысловы турызм у Рэспубліцы Беларусь: аналіз сучаснага стану і перспектывы развіцця».

«Летась адзначаны значны рост папулярнасці прамысловага турызму. Агульная колькасць наведвальнікаў прамысловых прадпрыемстваў склала звыш 266 тысяч чалавек, уключаючы прадпрыемствы сістэмы Міністэрства прамысловасці, канцэрнаў «Беллегпрам» і «Белдзяржхарчпрам», а таксама Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва. Найбольшы рост наведвальнасці зафіксаваны на прадпрыемствах сістэмы Міністэрства прамысловасці», — адзначылі ў Нацыянальным агенцтве.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1365	Весы РП-1Ш-13С, инв. № 302Т	50,40	5,04	2,52
1375	Кабина б/у без док., инв. № 6063	407,40	40,74	20,37
1378	Компьютер ELATRON L 1734; компьютер ACT, инв. № 1010; компьютер PHILIPS, инв. № 1044А; компьютер, инв. № 301-О; факс PANASONIC-KX-FT 98, инв. № 3056; компьютер ELATRON L 1734, инв. № 3069; компьютер 215, инв. № 5005; компьютер TOWER, инв. № 5007А; компьютер TOWER, инв. № 5008; локальные сети с компьютером, инв. № 114; многофункциональное устройство	351,12	35,11	17,56
1379	Стекло, 20 кв. м; шкив; ремень, 4 шт.; цепь зерновая, 4 шт.; пружина растяжная, 30 шт.; редуктор нижний-вальц; редуктор цилиндрич.	718,20	71,82	35,91
1380	Автомобиль LADA52-88АК, инв. № 19170 (без док.)	756,00	75,60	37,80
1381	Емкость для зерна	966,00	96,60	48,30
1383	Секция с дубовым фасадом, инв. № 27; секция, инв. № 268-О; письменный стол; вешелка; стеллаж офисный; стол письменный; стол угловой; стул на раме блок 2 стула, 5 шт.; стул на раме блок 3 стула, 7 шт.; тумба офисная; тумба под орг. техн.; шкаф-купе	862,26	86,23	43,11
1385	Сеелка СТВ, инв. № 282-О	2 772,00	277,20	138,60
1388	Почвообрабатывающий агрегат АПП 6Д б/у, инв. № 6034	16 296,00	1 629,60	814,80
1900	Комбайн КЗС-1218-10, инв. № 3124т	62832,00	6283,20	3141,60
1901	Комбайн КЗС-1218-10, инв. № 3122	62832,00	6283,20	3141,60
1902	Опрыскиватель «Мекосан» 2000-18, инв. № 3052А	11424,00	1142,40	571,20
1903	Протравитель семян ПС-20, инв. № 3113	4368,00	436,80	218,40

Лот	Наименование	Земельный участок и местонахождение	Начальная цена без учета НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
2036	Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-62162 (назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – здание одноквартирного жилого дома, общая площадь (протяженность) – 98,1 кв. м; составные части и принадлежности – двухэтажный кирпичный жилой дом с гаражом, четырьмя сараями, навесом, уборной	Земельный участок с кадастровым номером 621384604101000110, для размещения объектов усадебной застройки (для обслуживания жилого дома), площадь – 0,1112 га (право аренды), расположенный по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи, ул. Молодежная, 15	31230,00	3123,00	1561,50

В отношении лотов №№ 1365, 1375, 1378–1381, 1383, 1385, 1388 проводятся шестые повторные торги.
Стоимость снижена на 65 %.
В отношении лотов №№ 1900–1903 проводятся третьи повторные торги.
Стоимость снижена на 30 %.
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 56 (30444) от 21.03.2025, стр. 10.
В отношении лота № 2036 проводятся первые повторные торги.
Стоимость снижена на 10 %.
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 42 (30430) от 01.03.2025, стр. 12

Местонахождение лотов №№ 1365, 1375, 1378–1381, 1383, 1385, 1388: Минская область, Вилейский р-н, д. Осиповичи.
Местонахождение лотов №№ 1900, 1901: Минская обл., Вилейский р-н, д. Шиловичи.
Местонахождение лотов №№ 1902, 1903: Минская обл., Вилейский р-н, Любанский с/с, д. Журихи

Дата и время проведения торгов	**22 апреля 2025 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 9 апреля 2025 года до 16.00 18 апреля 2025 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 22.04.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский яшик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1365, 1375, 1378–1380, 1381, 1383 – 10 %, по лотам №№ 1385, 1903 – 9 %, по лотам №№ 1388, 1902, 2036 – 7 %, по лотам №№ 1900, 1901 – 6 % от конечной цены предмета торгов.** Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону **+375299999112, Чеслав.** Дополнительная информация по лоту № 2036 по тел. **+375293058650, Алена.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.
При реализации НДС не начисляется на основании подп. 1.33 п. 1 ст. 118 Налогового Кодекса Республики Беларусь

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» 13 мая 2025 г. проводит открытый аукцион на право размещения (установки) нестационарных объектов на землях общего пользования населенных пунктов в Минском районе

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право размещения (установки) нестационарных объектов на землях общего пользования населенных пунктов.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 13.01.2023 № 32 и решением Минского областного исполнительного комитета от 25.10.2023 № 1051.

№ лота	Местонахождение	Координаты	Размер места	Площадь места (м²)	Вид объекта	Функциональное назначение нестационарного объекта	Цель размещения (установки) нестационарного объекта	Вид деятельности	Начальная цена предмета аукциона/ сумма задатка (бел. руб.)	Размер ежемесячно уплачиваемой платы за размещение (установку) нестационарного объекта (бел. руб.)	Срок размещения (установки) нестационарного объекта
1	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
2	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
3	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация мясной продукции	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
4	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация мясной продукции	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
5	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
6	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
7	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация деталей и принадлежностей для автомобилей	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
8	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	оказание услуг (ремонт обуви, одежды)	розничная торговля	726,30	145,25	2 года
9	г. п. Мачулищи, ул. Зеленая	53.784076, 27.594165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация товаров общественного питания	общественное питание	726,30	145,25	2 года
10	г. Заславль, ул. Советская, д. 98 (торец жилого дома)	54.010816, 27.27091	5х3	15	передвижной	емкость для хранения и продажи товаров	реализация рыбной продукции	розничная торговля	938,65	187,73	2 года
11	г. Заславль, ул. Дзержинская, возле д. 3 (автомобильная стоянка)	53.995752, 27.273715	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	691,20	138,24	2 года
12	г. Заславль, ул. Юбилейная (автомобильная стоянка)	54.011219, 27.30813	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	691,20	138,24	2 года
13	Колодищанский с/с, д. Юховка, ул. Окольная	53.978519, 27.856138	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	204,10	40,82	2 года
14	Колодищанский с/с, д. Юховка, ул. Окольная	53.978481, 27.856165	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	204,10	40,82	2 года
15	Колодищанский с/с, д. Юховка, ул. Окольная	53.978428, 27.856422	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	204,10	40,82	2 года
16	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Военный городок, вблизи жилого дома № 223	53.964111, 27.759689	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	582,35	116,47	2 года
17	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Военный городок, вблизи жилого дома № 223	53.963975, 27.759675	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	582,35	116,47	2 года
18	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Энтузиастов	53.918794, 27.753547	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	567,25	113,45	2 года
19	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Тюленина, вблизи дома № 8А	53.952687, 27.783743	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	709,05	141,81	2 года
20	Колодищанский с/с, аг. Колодищи, ул. Ягодная, вблизи дома № 2	53.918694, 27.753774	3х3	9	передвижной	павильон	реализация товаров общественного питания	общественное питание	567,25	113,45	2 года
21	Горанский с/с, аг. Новоселье, ул. Школьная	53.917735, 27.193116	3х3	9	передвижной	палатка	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	168,80	33,76	2 года
22	Горанский с/с, аг. Новоселье, ул. Школьная	53.917814, 27.19305	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	168,80	33,76	2 года
23	Горанский с/с, аг. Чачково, ул. Центральная	53.893607, 27.20009	3х3	9	передвижной	палатка	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	112,75	25,55	2 года
24	Горанский с/с, аг. Чачково, ул. Центральная	53.893754, 27.200056	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	112,75	25,55	2 года
25	Горанский с/с, д. Новое Поле, ул. Центральная	53.972973, 27.128551	3х3	9	передвижной	палатка	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	43,70	8,74	2 года
26	Михановичский с/с, аг. Михановичи, ул. Советская, в районе ФОК «КИТ»	53.743435, 27.701125	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	204,85	40,97	2 года
27	Михановичский с/с, аг. Чуриловичи, в районе детского сада	53.751985, 27.575078	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	145,35	29,07	2 года
28	Боровлянский с/с, аг. Лесной, ул. Мирная	54.005920, 27.681817	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация хлебобулочных и кондитерских изделий	розничная торговля	744,90	148,98	2 года
29	Боровлянский с/с, аг. Лесной	54.005024, 27.678557	5х3	15	передвижной	емкость для хранения и продажи товаров	реализация рыбной продукции	розничная торговля	744,90	148,98	2 года
30	Боровлянский с/с, аг. Лесной (между магазином «Универмаг» и парковкой ТС «МК Лесной 19В»)	54.005072, 27.679824	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	744,90	148,98	2 года
31	Боровлянский с/с, д. Лесковка, около магазина «Родны Кут»	54.001089, 27.708221	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	462,40	92,48	2 года
32	Новодворский с/с, аг. Гатово, ул. Металлургическая, вблизи д. №6	53.783033, 27.633705	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	515,60	103,12	2 года
33	Новодворский с/с, аг. Гатово, ул. Металлургическая (напротив ГУО «Гатовская СШ»)	53.7833, 27.63056	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	515,60	103,12	2 года
34	Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, ул. Калинина	53.738579, 27.505435	3х3	9	передвижной	палатка	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	259,80	51,96	2 года
35	Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, ул. Калинина	53.738815, 27.505781	3х3	9	передвижной	палатка	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	259,80	51,96	2 года
36	Шершунский с/с, д. Новый Двор	54.127118, 27.348338	3х3	9	передвижной	палатка	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	41,55	8,31	2 года
37	Шершунский с/с, д. Новый Двор	54.127195, 27.348371	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	41,55	8,31	2 года
38	Шершунский с/с, аг. Шершуны	54.184842, 27.360923	3х3	9	передвижной	палатка	реализация одежды швейной, трикотажной	розничная торговля	30,40	6,08	2 года
39	Шершунский с/с, аг. Шершуны	54.184833, 27.36081	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	30,40	6,08	2 года
40	Крупицкий с/с, аг. Крупица, ул. Садовая	53.676593, 27.530296	3х3	9	передвижной	палатка	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	106,25	21,25	2 года
41	Крупицкий с/с, аг. Крупица, ул. Садовая	53.67662, 27.529923	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация мясной продукции	розничная торговля	106,25	21,25	2 года
42	Крупицкий с/с, аг. Крупица, ул. Садовая	53.676873, 27.529774	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	106,25	21,25	2 года
43	Крупицкий с/с, д. Вишневка	53.677248, 27.500582	3х3	9	непередвижной	павильон	реализация продовольственных товаров	розничная торговля	83,55	16,71	2 года
44	Луговослободской с/с, аг. Луговая Слобода	53.78190, 27.83685	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	170,20	34,04	2 года
45	Луговослободской с/с, д. Обчак	53.81455, 27.810202	3х3	9	непередвижной	палатка	реализация продовольственных товаров	розничная торговля	173,85	34,77	2 года
46	Сеницкий с/с, аг. Атолино, ул. Центральная, вблизи д. 1и	53.783771, 27.428811	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	251,45	50,29	2 года
47	Папернянский с/с, аг. Большевик	54.004834, 27.568122	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	516,50	103,3	2 года
48	Папернянский с/с, аг. Большевик	54.003184, 27.569479	3х3	9	передвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	516,50	103,3	2 года
49	Папернянский с/с, аг. Вишневка	54.062605, 27.557070	3х3	9	передвижной	павильон	реализация плодоовощной продукции	розничная торговля	187,90	37,58	2 года
50	Папернянский с/с, аг. Семково	54.023850, 27.434487	4х3	12	передвижной	фуд-трак	реализация товаров общественного питания	общественное питание	264,40	53,08	2 года

Аукцион состоится *13 мая 2025 года* в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, **по 6 мая 2025 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

Контактные телефоны: +375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Задатки перечисляются не позднее 6 мая 2025 г. на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 05520, код категории платежа – OTHR, код назначения платежа – 40901.

Для участия в аукционе необходимо:

внести задаток (задатки) не позднее 6 мая 2025 г. в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов аукциона – задаток вносится в размере, установленном для каждого предмета аукциона);

представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на внесение платы за право аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования – для юридических лиц или индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;

копии учредительных документов и выписки из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения – для иностранных юридических лиц.

При подаче документов:

индивидуальный предприниматель, желающий участвовать в аукционе, предъявляет документ, удостоверяющий личность;

представитель лица, желающего участвовать в аукционе, предъявляет:

документ, удостоверяющий личность;

доверенность, за исключением случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель;

документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы, подтверждающие полномочия), – если юридическое лицо представляет его руководитель.

Документы, указанные в частях первой и второй настоящего пункта, составленные на иностранном языке, представляются (предъявляются) с переводом на белорусский или русский язык (верность перевода или подлинность подписи переводчика подлежат засвидетельствованию нотариально).

Торги в отношении каждого предмета аукциона проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 5 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан:

внести плату за предмет аукциона за вычетом суммы задатка, перечисленной организатору аукциона;

возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

Не позднее 5 рабочих дней после совершения названных действий победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) заключает договор с соответствующим местным исполнительным комитетом.

В случае отказа или уклонения лица, приравненного к победителю аукциона, от оплаты стоимости предмета аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона внесенный им задаток возврату не подлежит.

Результаты аукциона аннулируются по решению организатора аукциона в случаях, если победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в установленный срок:

не подписал(о) протокол о результатах аукциона;

не возместил(о) организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона;

не оплатил(о) цену продажи предмета аукциона.

Внесенный им задаток в этих случаях не возвращается.

В случае аннулирования результатов аукциона по основаниям, указанным в части первой настоящего пункта, победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) уплачивает штраф в размере **4 200,00** белорусских рублей и возмещает организатору аукциона сумму затрат на его организацию и проведение.

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах: **minsk-region.gov.by, rlt.by**

ФІТАТЭРАПІЯ

АПТЭКА НА ГРАДЦЫ

Якія лекавыя расліны можна вырасціць на дачы?

Вясна — час пачатку дачнага сезона. У многіх на падаконніках падрастае расада, а ў крамах вока ўсё часцей затрымліваецца на пакеціках з насеннем: «Што б яшчэ такое карыснае і няцяжкае ў абыходжанні пасадзіць?» Можна паспрабаваць разнастаіць флору свайго прысядзібнага ўчастка, высадзіўшы лекавыя расліны, многія з якіх ужываюцца яшчэ і ў якасці вострых прыпраў у кулінарыі. Ці шмат набярэцца раслін, здольных выносіць капрызы нашага надвор'я? Так, нямала.

МАЦЯРДУШКА

Мацярдушка звычайная, вядомая пад моднай назвай арэгана, — шматгадовая травяністая расліна. Выкарыстоўваецца як вострапахучая і лекавая расліна. У якасці сыравіны выкарыстоўваюць траву мацярдушкі, якую нарыхтоўваюць падчас яе масавага цвіцення.

— Мацярдушку можна ўжываць у якасці адхаркавальнага сродку пры захворваннях дыхальных шляхоў (вострыя і хранічны бранхіт, вострыя рэспіраторныя вірусныя інфекцыі), у якасці сродку, які павышае апетыт і паляпшае страваванне, пры сакраторнай недастатковасці страўнікава-кішачнага тракта, пры атаніі кішэчніка, пры энтэракалітах, якія суправаджаюцца запорамі і метэарызмам, у складзе комплекснай тэрапіі пры піядэрміі і атапічным дэрматыце, — расказвае **інструктар-валеолаг Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Юлія КЛІМЧАНКА.**

У кулінарыі мацярдушку дадаюць да мясных страў, соусаў і падлівак.

ЛЮБІСТА

Любіста валодае спецыфічным пахам, які нагадвае пах сельдэрэю. Лісце гэтай магутнай шматгадовай расліны выкарыстоўваюць для араматызацыі кандытарскіх вырабаў, напояў, марынадаў, пры гатаванні зялёнага алею, салатаў, соусаў.

— Настоі і адвары каранёў выкарыстоўваюць для лячэння захворванняў нырак, мочавыводзячых шляхоў, у якасці адхарквальнага сродку, для паляпшэння сну, стрававання і апетыту, — раіць Юлія Клімчанка.

МЯТА ПЕРЦАВАЯ

Мята валодае асвяжальным водарам і смакам. З эфірнага масла гэтай расліны быў выдзелены ментол, які шырока прымяняецца ў харчовай прамысловасці і медыцыне. У прыватнасці, з'яўляецца асноўным складнікам сасударасшыральнага сродку валідол.

Настой лісця мяты перцавай валодае спазмалітычным, заспакаяльным, жаўцягонным, мясцовараздражняльным, процірвотным дзеянням.

Пры зборы лекавай сыравіны неабходна ведаць, дзе менавіта ў расліне сканцэнтраваны карысныя элементы, у які перыяд развіцця іх канцэнтрацыя максімальная, і правільна захоўваць сыравіну, каб не страціць яе карысць.

КАЛЕНДУЛА

Яркія кветкі календулы ўпрыгожаць прысядзібны ўчастак і дапамогуць адпудзіць насякомых-шкоднікаў. Але нямала карысці ў гэтай расліне і для нашага здароўя. За кошт ярка выяўленых антысептычных, супрацьзапаленчых, раназажыўляльных уласцівасцяў настой з кветак календулы ўжываюць для лячэння запаленчых захворванняў поласці рота і горла, нязначных пашкоджанняў скуры. Расліну выкарыстоўваюць для вырабу касметычных сродкаў, а жаўцягонныя і спазмалітычныя ўласцівасці календулы выкарыстоўваюцца пры лячэнні халецыстыту, халангіту, дыскінезіі жоўцевыводзячых шляхоў.

У ежу выкарыстоўваюцца пялёсткі расліны, якія надаюць страве лёгкі водар і прывабны выгляд. Калісьці календулу называлі «шафран бедняка», замяняючы ёй больш дарагія вострыя прыправы.

СКАЖЫЦЕ, ДОКТАР...

ПАГЛАДЗІЎ КОЦІКА І ПАДХАПІЎ ЛІШАЙ

Што трэба ведаць пра мікраспарыю

Нават у XXI стагоддзі, у эпоху тэхналагічных прарываў, чалавецтва яшчэ пакутуе ад такога захворвання скуры, як лішай, ці мікраспарыя. Ад гэтага грыбковага захворвання часцей пакутуюць дзеці. А вінаватымі ў ім з'яўляюцца браты нашы меншыя — бяздомныя і нават хатнія жывёлы. Пра тое, як пазбегнуць гэтай непрыемнай і вельмі заразнай хваробы, расказала **ўчастковы ўрач-педыятр 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Іна ТАМАШЭВІЧ.**

Карысна ведаць, што ў жывёл хвароба працякае доўгі час непрыкметна, і яны выглядаюць зусім здаровымі. Затым з'яўляюцца ўчасткі са скарыначкамі на галаве (часцей на мордзе, каля вушэй) і каля хваста, потым пачынае выпадаць шэрсць. Калі ваш чатырохногі гадаванец захварэў на мікраспарыю, не выкідвайце яго на вуліцу: захворванне паспяхова лечыцца як у чалавека, так і ў жывёл.

ДЗЕЦІ — У ЗОНЕ РЫЗЫКІ

Мікраспарыя («стрыгучы лішай») — гэта грыбковае заразнае скурнае захворванне чалавека і жывёл (катоў, радзей сабак і інш.). У чалавека пры захворванні на мікраспарыю пашкоджваецца пераважна скура і валасы. Узбуджальнік — патагенныя грыбы роду Мікраспорум.

На мікраспарыю часцей за ўсё хварэюць дзеці. Гэта тлумачыцца тым, што ў малых слабая ахоўная функцыя скуры, а вось у дарослых у сакрэце скурных залоз прысутнічае шмат тлустых кіслот, згубных для ўзбуджальніка мікраспарыі.

АДКУЛЬ ЗАРАЗА?

Большасць прадстаўнікоў сямейства грыбоў Мікраспорум характарызуюцца высокай устойлівасцю ў навакольным асяроддзі і могуць захоўваць сваю жыццяздольнасць у лускавінках скуры, у абломках валасоў і шэрсці жывёл на працягу многіх месяцаў і нават некалькіх гадоў.

Чалавек заражаецца мікраспарыяй пры непасрэдным кантакце з хворымі жывёламі (а часам і людзьмі) або праз навакольныя аб'екты, на якіх знаходзяцца споры грыба: адзенне, ручнік, галаўныя ўборы, пасцельныя рэчы, цацкі, лежакі і прадметы догляду жывёл.

Схаваны інкубацыйны перыяд (з моманту заражэння да з'яўлення клінічных сімптомаў захворвання) можа доўжыцца ад 5—7 дзён да 4—6 тыдняў. А потым захворванне дасць аб сабе знаць. На скуры з'явяцца круглыя або авальныя, выразна акрэсленыя плямы. На краі плямы фармуецца валік, які ўзвышаецца, прадстаўлены дробнымі вузельчыкамі, пузыркамі і скарыначкамі. Цэнтральная частка плямы мае больш бледную афарбоўку, з вотруб'епадобным лушчэннем на паверхні. Такім чынам, ачаг мае выгляд кольца.

На валасістай частцы галавы ўзнікае ўчастак, у якім валасы абламаныя на вышыні 4 — 6 мм і выглядаюць як бы падстрыжанымі (адсюль назва «стрыгучы лішай»), пянькі валасоў пакрытыя чахлом шаравата-белага колеру са спор грыба.

БЕЗ САМАЛЯЧЭННЯ

Лячэнне хворых на мікраспарыю працяглае. Па яго прызначэнне неабходна звярнуцца да ўрача-дэрматолага. Важна ведаць, што пасля перанесенага захворвання імунітэт не выпрацоўваецца і можна захварэць паўторна.

Перш чым узяць дадому кацяня ці шчанюка, пакажыце жывёлу ветэрынарнаму ўрачу, каб быць упэўненым, што гадаванец здаровы. Не пажадана кантактаваць (не гладзіць і не дазваляць дзецям гуляць) з бяздомнымі жывёламі (кошкі, сабакі), таксама не рэкамендуецца браць у ложак чатырохногіх сяброў. У гадаванца ў доме павінна быць сваё нязменнае месца, якое неабходна ўтрымліваць у чысціні.

Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, земельного участка в частную собственность с расположенным на нем не завершенным строительством незаконсервированным жилым домом и пустующего жилого дома

Организатор электронных торгов: Туринский сельский исполнительный комитет, Минская обл., Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, 49Б, тел.: (801713) 98635, 43296, 8(029) 7503249.
Оператор электронной торговой площадки: открытое акционерное общество «Белорусская универсальная товарная биржа». **Электронный адрес электронной торговой площадки:** www.et.butb.by.
Дата проведения электронных торгов: **8 мая 2025 г. Время проведения электронных торгов** устанавливается ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество»

№ лота	Адрес объекта, характеристики	Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права	Площадь земельного участка, *га*	Инженерная инфраструктура (возможность подключения)	Начальная цена, *руб.*	Задаток, *руб.*	Расходы по подготовке, *руб.*
1	Минская область, Пуховичский р-н, д. Тешково, ул. Центральная, уч. 10, объем (площадь строения) 61 кв. м, готовность строения – 6 %, фундамент – бетон	624487908601000101, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность	0,1063	Сети электроснабжения	2 859,11 (земельного участка – 1307,49, капитального строения – 1 551,62)	285,91	Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2 341,09 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки
2	Минская область, Пуховичский р-н, д. Шкавиловка, уч. 24Б	624487910101000098, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность	0,1228	Сети электроснабжения, газоснабжения	3 000,00	300,00	Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2972,61 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки
3	Минская область, Пуховичский р-н, аг. Турин, ул. Центральная, уч. 35А	624487909101000299, строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность	0,1509	Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения	3500,00	350,00	Затраты на организацию и проведение электронных торгов 2948,70 + расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки
4	д. Подбережье, ул. Хлебовка, д. 4, одноквартирный бревенчатый жилой дом площадью 56,0 кв. м с хозпостройкой	Земельный участок в пользовании	0,2500	Сети электроснабжения	42,00	8,40	Расходы на публикацию в СМИ, расходы на оплату услуг оператора эл. торговой площадки

Задаток для участия в электронных торгах перечисляется на текущий (расчетный) счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

Срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в электронных торгах. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в торгах.

Окончание приема заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми к ним документами – **2 мая 2025 года, до 15.00.**

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов. Оплата стоимости предмета торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.30–13.00, 14.00–17.30).

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением «О порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608, и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа» от 29.12.2015 № 143

СКАНВОРД



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: Адпачынак. Рык. Вяз. Сафа. Агу. Мяў. Адвакат. Агат. Куб. Раба. Аса. Дно. Амар. Ату. Час. Волат. Клоп. Ярмо. Лепка. Клара. Шалі. Сасна.

Па вертыкалі: Перавага. Чака. Навум. Кузаў. Лістапад. Ярус. Варона. Кабан. Атам. Карал. Батут. Танк. Чарка. Скокі. Волас. Опера. Пас. Ака.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

Надвор'е на заўтра

Месяц

Першая чвэрць 05.04—12.04. Месяц у сузор'і Дзевы.

МІНСК 757 мм рт.сл.	-3..0°C	-1..0°C
ВІЦЕБСК 757 мм рт.сл.	-3..-1°C	-1..+1°C
МАГІЛЁЎ 756 мм рт.сл.	-2..0°C	-1..+1°C
ГОМЕЛЬ 755 мм рт.сл.	-2..0°C	-1..0°C
ГРОДНА 762 мм рт.сл.	-2..0°C	+2..+3°C
БРЭСТ 762 мм рт.сл.	+2..+4°C	+3..+4°C

Геамагнітныя ўзрушэнні

22 гадз. 01 гадз. 04 гадз. 07 гадз. 10 гадз. 13 гадз. 16 гадз. 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

Паводле даных Белгідрамета

...у суседзяў

МАСКВА +3..+5°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ -3..-1°C

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

9 КРАСАВІКА Даты Падзеі Людзі

У краіне

1910 год — нарадзіўся Ісай Паўлавіч Казінец, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў мінскага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Да вясны 1942 года сетка падполля, створаная Казінцом, здзейсніла каля 100 дыверсійных аперацый у горадзе. 26 сакавіка 1942 г. Казінец быў арыштаваны СД, і 7 мая 1942 разам з 28 удзельнікамі падполля быў павешаны ў гарадскім Аляксандраўскім скверы. У 1965 годзе яму пасмяротна прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. У Мінску ёсць плошча і вуліца, названыя ў гонар Казінца. Яго дзейнасць стала асновай для напісання раманаў «Руіны страляюць ва ўпор» (аўтар І. Новікаў) і «Прароцтва Казінца» (Л. Зубараў).

1934 год — нарадзіўся (в. Лошыца, цяпер у межах Мінска) Леанід Мікалаевіч Асядоўскі, беларускі жывапісец, педагог. Працаваў у станковым жывапісе. Значнае месца ў творчасці займала тэма сучаснасці: карціны «Няхай будзе сонца», «Нафта беларуская ёсць!», «Дажынкі», «Салігорскія шахцёры», «Балада пра маці» і інш. Стварыў трыпціхі «М. В. Фрунзэ ў Мінску». Аўтар дыярам «Мінскі «кацёл» для Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску, «Бой пад Мілаславічамі» для Клімавіцкага краязнаўчага музея і інш.

У свеце

1667 год — у Луўры (сёння — адзін з найвядомейшых музеяў свету) адкрылася першая ў свеце мастацкая выстаўка.

1821 год — нарадзіўся Шарль Бадлер, французскі паэт, літаратурны крытык і перакладчык. Імя Бадлера стала сімвалам літаратурнага і артыстычнага дэкадансу. Яго творы, у прыватнасці паэтычны зборнік «Краскі зла» (па-французску: Les fleurs du mal), былі прызнаны класікай французскай літаратуры.

1860 год — зроблены самы ранні вядомы разборлівы запіс гуку чалавечага голасу: англійскі вынаходнік Скот запісаў на ўстройства, як хтосьці спявае песню «Au Clair de la Lune» («Пры святле месяца»).

АЛЁНАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

КАПУСТА БЫВАЕ НАРМАЛЬНАЯ І...

— Я дома, — гукнуў з парога Іван. — Галодны як воўк. Пакорміш?

— А як жа! — усміхнулася насустрач жонка. — Мый рукі і за стол.

Праз хвіліну гаспадар ужо заняў сваё крэсла і сапраўды наваліўся на ежу.

— Малайчына ты ў мяне! — умінаючы то адно, то другое, нахвальваў жонку. — Смачна — як у рэстаране!

— Нават лепей, бо там — смяялася яна, — хворай капустай цябе не накормяць.

— Адзін — нуль. На тваю карысць, — згадзіўся Іван.

...Дачнікам ён быў ніякім. Здаралася, выстаўляў з машыны вёдры з памідорамі, карзіны з агуркамі ды перцамі, чуў ад бабуль, што днямі сядзелі на лавачцы: «Вось малайцы дык малайцы! Такі ўраджай!»

У Івана ад гэтых слоў аж нос да нябёс!.. Хоць, калі па шчырасці, не было ў тым яго заслугі: жонка сеяла ўсё, яна даглядала, дзякуючы ёй на стале заўсёды былі гародніна і свежае зеляніва... Зноў жа эканомія, бо паспрабуй усё гэта купіць — летам... А ўжо зімой...

Любіў Іван прынесці з падвала слоічак хрусткіх агурочкаў, спелых памідораў. І салаты яго гаспадыня ставіла, і марозіла шмат што, потым гатавала... Ён, шчыра кажучы, не дужа разбіраўся, што там з чаго, але ж еў са смакам.

Вось і цяпер у яго на талерцы быў файны гарнір. Шкада, што малавата.

...На дачу ў той выхадны ён паехаў адзін. Жонка загадала капусту прапалоць, то-бок павырываць на градцы ўсё, апроч той самай капусты. Работа — прасцей не прыдумаеш.

— Будзе зроблена, — паабяцаў гаспадар. — Што-што, а капусту я ні з чым не зблытаю.

Іван стараўся, ён апалоў ледзь не ўсю граду, разлічваў, што жонка пахваліць, а замест гэтага...

— Што ты нарабіў?! — закрычала яна, прымаючы працу. — Ты ж усю цвятную капусту пасек!

— Дык я ж думаў, што гэта нармальная — проста захварэўшы, — апраўдваўся Іван.

— Сам ты захварэў... На ўсю галаву! — злавала гаспадыня. — Адны страты ад тваёй дапамогі!

Дзён праз колькі яна, праўда, пацішэла, але не забылася: да сёння ўспамінае тую хворую капусту.

Вольга Савасцюк, *г. Мар'іна Горка.*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 318. Індэкс 63850. Зак. № 782.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 красавіка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12